Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 СТУДЗЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 21 (28637)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Характаства аграсядзібы – узімку**

СТАР. 5



**Эфектыўны сродак ад... наіўнасці**

СТАР. 6



**Як падрыхтаваць спіну да дачнага сезона**

СТАР. 12

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Алена КУХАРЭВІЧ, намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта:**

*«Змяніць свядомасць і звычкі, выпрацаваць прыхільнасць да здаровага ладу жыцця складана, але выканальна. У якасці пацвярджэння можна прывесці той факт, што на працягу шэрагу гадоў доля курцоў ад агульнага насельніцтва краіны ва ўзросце 16 гадоў і старэйшых павольна, але зніжаецца. Калі ў 2011 годзе яна складала каля 27 %, то ў 2017-м — 23 працэнты. За гэты перыяд доля мужчын, якія кураць, скарацілася з 51 % да 44 %, сярод жанчын — з 10 % да 9 %. Пры гэтым з агульнага ліку тых, хто курыць, больш за 60 % хацелі б пазбавіцца гэтай шкоднай звычкі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.01.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9839 | ▲ |
| Еўра | 2,4514 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0352 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0708 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Аўтакрама прыехала



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Навасёлкі, Барысаўскі раён.

■ Актуальна

## НЕ ТОЛЬКІ ВЫСОКІ БАЛ АТЭСТАТА...

### У Міністэрстве адукацыі агучылі асноўныя задачы на найбліжэйшы год

**«У сучасным свеце ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё шмат у чым залежыць ад узроўню і якасці адукацыі. Сістэма адукацыі павінна быць гнуткай, адказваць на глабальныя выклікі, змяняцца і ўдасканальвацца ў інтарэсах чалавека, грамадства і дзяржавы», — такую думку агучыў на выніковай калегіі свайго ведамства міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

СТАР. 4



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## КРАН ПАМЫЛАК НЕ ДАРУЕ

### Як пазбегнуць няшчасных выпадкаў на вышыні?

**Будаўнічыя работы нельга ўявіць без крана. Функцыянаванне гэтых «жалезных памочнікаў» няўхільна звязана з жорсткім выкананнем правілаў тэхнікі бяспекі. Парушэнне яе можа прывесці ў найгоршым выпадку і да лятальнага канца. Летась у Беларусі зарэгістравана 10 здарэнняў падчас работы кранаў. Прычыны ў асноўным маюць арганізацыйны характар. Гэта значыць, калі б супрацоўнікі выконвалі правілы тэхнікі бяспекі, то нічога б і не здарылася. І толькі аднойчы прычыны няшчаснага выпадку былі і арганізацыйныя, і тэхнічныя. Усе кропкі над «і» дапамаглі расставіць у Дзяржпрамнаглядзе.**

**«Букет» парушэнняў скончыўся смерцю**

У Гомельскай вобласці летась адбылося чатыры няшчасныя выпадкі пры выкананні работ грузапад'ёмнымі кранамі. Тры з іх прывялі да цяжкіх вытворчых траўмаў. Адзін скончыўся смерцю. Адметна, што ў 2016 годзе ў рэгіёне быў зарэгістраваны ўсяго адзін няшчасны выпадак.

СТАР. 6

# Усходняе партнёрства:
## неабходна вырашаць практычныя пытанні

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з еўракамісарам па еўрапейскай палітыцы суседства і перагаворах аб пашырэнні ЕС Ёханесам Ханам. Кіраўнік дзяржавы спадзяецца, што гэты візіт еўракамісара ў Мінск прынясе значныя вынікі ў адносінах паміж Беларуссю і Еўрасаюзам.**

Беларускі лідар адзначыў, што катэгарычна супраць цэнтрабежных сіл, з-за якіх слабее Еўрасаюз: «Мы прыхільнікі шматпалярнага свету. Еўрапейскі саюз — адна з наймагутных апор нашай планеты, і разбурэнне гэтай, можна сказаць, асноўнай апоры шматпалярнага свету прывядзе да разбурэння сістэмы не толькі бяспекі, але і эканомікі, і ўсіх іншых сфер жыцця на нашай зямлі».

Акрамя таго, ЕС з'яўляецца для нас значным гандлёвым партнёрам і стаіць на другім месцы пасля Расіі. У сувязі з гэтым наша краіна зацікаўлена ў пашырэнні эканамічных сувязяў.

Гаворачы аб праекце Усходняга партнёрства, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што трэба больш арыентавацца на практыку, каб можна было вырашаць задачы, якія стаяць перад Еўропай, і прасоўваць праекты ў актуальных сферах, як, напрыклад, энергетыка, транспарт, лагістыка. А таксама вырашаць візавыя пытанні: гэта дазволіць мець двухбаковыя зносіны ў большым аб'ёме.

Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што нельга дапусціць, каб Усходняе партнёрства было занадта палітызаванае. Пояс з краін-удзельніц гэтага праекта не павінен стаць раздзяляльнай зонай паміж Еўрасаюзам, з аднаго боку, і Расіяй, Кітаем, усходнімі краінамі — з другога. Беларусь будзе заўсёды прыхільніцай добрасуседства і гатова і надалей уносіць уклад у забеспячэнне бяспекі еўрапейскага кантынента, запэўніў беларускі лідар.

Ёханес Хан, у сваю чаргу, адзначыў, што ў такой вялікай структуры, як ЕС, заўсёды ёсць некаторыя праблемы, выкліканыя ўнутранымі ці знешнімі працэсамі. Сярод найбольш сур'ёзных еўракамісар адзначыў міжнародны фінансава-эканамічны крызіс і хвалю міграцыі. Да таго ж прыходзіцца займацца «брэкcітам». Аднак усе складаныя сітуацыі, на яго думку, прывялі да ўзмацнення інтэграцыі ўнутры ЕС і мабілізавалі падтрымку насельніцтва.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# Мытная служба:
## санкцыйныя тавары і вынікі 2017 года

**Падчас сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Юрыем Сянько абмяркоўваліся надзённыя пытанні беларускай мытні.**

У прыватнасці, Юрый Сянько паведаміў пра вынікі работы за мінулы год. Так, летась ад мытных збораў у бюджэт паступіла на $412 млн больш, чым годам раней.

Беларускі лідар адзначыў, што аднымі з кірункаў з'яўляюцца супрацоўніцтва з Расіяй і вырашэнне пытанняў з санкцыйнымі таварамі. Тое, што ў Беларусі навучыліся ў штучных умовах вырабляць ікру, гэта добра. «Але тым не менш хацелася б пагаварыць аб'ектыўна: у чым нам яшчэ трэба папрацаваць, каб прэтэнзій з боку расіян было менш? І як развіваецца тут наша супрацоўніцтва з Расіяй. Як бы там ні было, а знешняя мяжа Саюзнай дзяржавы пад Брэстам, а не пад Смаленскам», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Юрый Сянько адзначыў, што летась было канфіскавана каля 10 тысяч тон санкцыйных тавараў коштам каля $9 млн. Сёлета мытныя органы працягнуць сумесную работу з расійскімі калегамі ў гэтым кірунку.

Пасля сустрэчы старшыня мытнага камітэта паведаміў журналістам, што летась мытнай службай было канфіскавана з незаконнага абароту больш за тысячу кілаграмаў цяжкіх наркотыкаў, распачата 41 крымінальная справа па факце перамяшчэння наркотыкаў. Чатыры буйныя партыі накіроўваліся ў Расію, пра што мытнікі паведамілі сваім калегам.

Да таго ж летась былі праведзены эксперыменты, звязаныя з Мытным кодэксам, які ўжо ўступіў у сілу. Бізнес ацаніў іх станоўча: 91 300 партый тавару былі аформлены ў аўтаматычным рэжыме.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### УЛАДЫ ЗША АДНАВІЛІ ПРЫЁМ БЕЖАНЦАЎ З 11 КРАІН

Міністэрства ўнутранай бяспекі ЗША (МУБ) зрабіла больш жорсткімі правілы прыёму ў краіне бежанцаў з 11 краін, тым самым зняўшы забарону на іх уезд у краіну. Пра гэта абвясціла кіраўнік гэтага ведамства Кірстэн Нільсэн, выступаючы ў Міжнародным цэнтры імя Вудра Вільсана. Спіс «небяспечных краін» падлягае перыядычнаму перагляду. Афіцыйна ён не апублікаваны, аднак, па звестках амерыканскіх СМІ, у яго ўваходзяць Егіпет, Іран, Ірак, Емен, КНДР, Лівія, Малі, Сірыя, Самалі, Судан і Паўднёвы Судан. Гэты пералік будуць пераглядаць кожныя сем месяцаў.

### КАМІТЭТ ЕЎРАПАРЛАМЕНТА ЎХВАЛІЎ ЗАПУСК САНКЦЫЙНАЙ ПРАЦЭДУРЫ ЕС СУПРАЦЬ ПОЛЬШЧЫ




Камітэт Еўрапарламента па грамадзянскіх свабодах, унутраных справах і юстыцыі падтрымаў рашэнне Еўракамісіі запусціць санкцыйную працэдуру супраць Польшчы за парушэнні еўрапейскіх прынцыпаў у мясцовай судовай рэформе. Як перадае карэспандэнт ТАСС, за гэтую прапанову прагаласавалі 33 дэпутаты пры неабходных 23. Згаданая працэдура можа прывесці да часовага пазбаўлення Варшавы права голасу ў Савеце ЕС, што стане першым прэцэдэнтам у гісторыі Еўрапейскага саюза. Зараз рашэнне павінна зацвердзіць пленарная сесія Еўрапарламента, якая пройдзе ў лютым.

### У САУДАЎСКАЙ АРАВІІ АДПУСЦІЛІ ЎСІХ ЗАТРЫМАНЫХ ПА СПРАВЕ АБ КАРУПЦЫІ

Усе затрыманыя па падазрэнні ў карупцыі высокапастаўленыя саудаўскія чыноўнікі і бізнесмены, якія ўтрымліваліся два месяцы ў пяцізоркавай гасцініцы Ritz Carlton у Эр-Рыядзе, пакінулі гатэль, паведаміла інфармагенцтва Reuters са спасылкай на афіцыйную саудаўскую крыніцу. Як вядома, у лістападзе мінулага года Вышэйшы камітэт па барацьбе з карупцыяй Саудаўскай Аравіі на чале з наследным прынцам распарадзіўся затрымаць каля 40 уплывовых персон, сярод якіх былі члены каралеўскай сям'і, колішнія міністры, ваенныя і прадпрымальнікі. На мінулым тыдні стала вядома, што ўрад гатовы вызваліць і зняць усе абвінавачванні з арыштаваных толькі пры ўмове, што яны заплацяць 100 мільярдаў долараў.

### КІТАЙ ЗАВАЛІЛА СНЕГАМ



Звыш трох мільёнаў чалавек пацярпела ў выніку снегападаў, якія абрынуліся на ўсходнія і цэнтральныя правінцыі Кітая. Паведамляецца пра як мінімум некалькіх загінулых. У выніку абрыву ліній электраперадачы без электраэнергіі засталося каля 280 тысяч хатніх гаспадарак. Больш за 90 працэнтаў пашкоджаных ЛЭП да цяперашняга часу ўжо адноўлены. Снегапады таксама сур'ёзна ўскладнілі транспартную сітуацыю. Прычым гэта адбылося якраз тады, калі ў Кітаі пачынаюцца навагоднія вакацыі і мільёны людзей выпраўляюцца ў падарожжы.

■ Будзь у курсе!

# Па неіміграцыйную візу ЗША — цяпер у Мінск

**Пасольства ЗША ў Беларусі з лютага будзе аказваць грамадзянам і рэзідэнтам Беларусі ўвесь спектр неімігрыцыйных візавых паслуг. Пра гэта журналістам паведаміў часовы павераны ў справах ЗША ў Беларусі Роберт Райлі.**

Паводле яго слоў, з 1 лютага консульскі аддзел пасольства пачынае прадастаўляць поўны спектр неіміграцыйных візавых паслуг. Гэта значыць, што любы грамадзянін і рэзідэнт Беларусі можа звярнуцца па візу любой катэгорыі ў Мінску.

Раней ужо паведамлялася, што з 1 лістапада мінулага года пасольства ЗША ў Мінску пачало прымаць заявы па гасцявыя, турыстычныя і дзелавыя візы (катэгорыя B1/B2) ад жыхароў і грамадзян Беларусі ва ўзросце 50 гадоў і больш. Апроч таго, заяўнікі любога ўзросту, чыя амерыканская віза любой катэгорыі скончылася менш за год таму, атрымалі магчымасць звяртацца па новую візу ў Мінску.

З 9 студзеня гэтага года амерыканскае дыппрадстаўніцтва зноў пашырыла візавыя паслугі і стала прымаць заявы ад рэзідэнтаў Беларусі на візы наступных катэгорый: A, C1/D, G, F, H, I, J, L, M, O, P і R.

Роберт Райлі адзначыў, што амерыканскае дыппрадстаўніцтва будзе аказваць такі спектр візавых паслуг упершыню за апошнія дзесяць гадоў. Разам з тым ён звярнуў увагу на тое, што пасольства ЗША ў Беларусі пакуль не можа прымаць заяўкі ад неграмадзян ці непастаянных жыхароў Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Інтэграцыя

# СНД АБРАЛА НАЗІРАЛЬНІКАЎ

## У Мінску прайшло пасяджэнне Савета пастаянных прадстаўнікоў Садружнасці

**Кандыдатуры кіраўнікоў місіі назіральнікаў на выбарах у Расіі і Туркменістане абмеркаваў Савет пастаянных прадстаўнікоў СНД. Плануецца, што кіраўніком місіі на прэзідэнцкіх выбарах у Расійскай Федэрацыі стане першы намеснік старшыні Выканаўчага камітэта СНД Віктар Гумінскі. На парламенцкіх выбарах у Туркменістане дэлегацыю ад СНД узначаліць старшыня Выканаўчага камітэта Сяргей Лебедзеў.**

Падчас пасяджэння таксама абмеркавалі парадак дня чарговага пасяджэння Савета міністраў замежных спраў, якое адбудзецца 6 красавіка ў Мінску. Працаваць у гэтым годзе Савет пастаянных прадстаўнікоў СНД будзе пад кіраўніцтвам новага старшыні — пастаяннага паўнамоцнага прадстаўніка Рэспублікі Таджыкістан, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Таджыкістана ў Беларусі Махмадшарыфа Хакдода. Прадставіў Сяргей Лебедзеў і свайго новага намесніка Агыбая Смагулава.

Асноўнымі кірункамі дзейнасці для СНД на 2018 год, па словах Сяргея Лебедзева, стануць умацаванне бяспекі краін — членаў Садружнасці і эканамічнае ўзаемадзеянне. «Прыярытэтам застаецца эканамічнае супрацоўніцтва. Нам важна працягваць рэалізацыю дагавора аб зоне свабоднага гандлю. Мы зараз працуем над падрыхтоўкай пагаднення аб зоне свабоднага гандлю паслугамі», — заявіў Сяргей Лебедзеў.

Асаблівая ўвага ў 2018 годзе, які аб'яўлены Годам культуры ў СНД, удзяляецца і гуманітарнаму супрацоўніцтву.

***

У той жа дзень з новым старшынёй Савета, Паслом Рэспублікі Таджыкістан у Беларусі сустрэўся **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** Падчас сустрэчы беларускі спікер выказаў надзею, што работа органаў СНД і надалей будзе ўдасканальвацца. «Важна, каб у СНД быў не толькі дыялог, але і прымаліся практычныя меры, накіраваныя на паляпшэнне нашых адносін, жыцця нашых людзей», — адзначыў ён.

Таксама Уладзімір Андрэйчанка нагадаў, што ў парламентах Беларусі і Таджыкістана створаны групы дружбы. Парламентарый мяркуе, што ім трэба больш ініцыятыўна працаваць. «Было б добра, каб у найбліжэйшай перспектыве было адпрацавана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж парламентамі Беларусі і Таджыкістана», — прапанаваў спікер.

Адна з не менш значных задач, якая стаіць перад абодвума парламентамі, — рост гандлёва-эканамічных адносін. Пра выставу беларускай прадукцыі, якая будзе прадстаўлена ў Душанбэ ўжо гэтай вясной, нагадаў спадар Пасол і дадаў, што гэта стане дадатковай магчымасцю для падпісання двухбаковых дакументаў паміж нашымі краінамі.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Вераніка ПУСТАВІТ.**

■ Па сезоне

# Грып узяў паўзу

**Студзень у Беларусі — традыцыйны час усплёску вірусных хвароб. Але гэтай зімой людзі больш хварэць на вострыя рэспіраторныя захворванні не сталі. Наадварот — захваральнасць за апошні тыдзень амаль на палову меншая, чым за такі ж перыяд гадавой даўнасці.**

— А па лабараторнай дыягностыцы мы не выявілі вірусаў грыпу, — кажа **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.** — Хутчэй за ўсё, перыяд захваральнасці ссунецца на сярэдзіну лютага. Усё будзе залежаць ад таго, якая сітуацыя складзецца ў найбліжэйшых краінах.

А яна неаднародная. З аднаго боку, у Літве, Латвіі і Расіі эпідэміялагічная сітуацыя нагадвае беларускую. З іншага — у Францыі вірусы грыпу цыркулююць ужо вельмі актыўна.

— Мабыць, нізкай захваральнасці спрыяе вільготнае надвор'е, — працягвае Іна Карабан. — Дапамагаюць нам і прышчэпкі: мы вакцынуем ад грыпу каля 40 працэнтаў насельніцтва. Гэты спосаб лячыцца найлепшым датычна яго прафілактыкі. Іншыя метады паказваюць ніжэйшую эфектыўнасць. Але разам з тым трэба захоўваць асабістую гігіену і выконваць кашлевы этыкет. Вельмі рэдка даводзіцца бачыць, калі хтосьці прыкрываецца падчас кашлю або карыстаецца папяровымі сурвэткамі. Акрамя таго, мужчынам мы рэкамендуем абыходзіцца без поціскаў рук, бо яны служаць асноўнай крыніцай мікробаў і вірусаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

# БАСКЕТБОЛ У РЭЖЫМЕ НОН-СТОП

## У Мінску прайшла рэпетыцыя Еўрагульняў

**Міжнародны турнір па баскетболе «Palova Snowball 3x3», які прайшоў у гандлёвым цэнтры «Сталіца», стаў па-сапраўднаму яркай спартыўнай падзеяй краіны. Яго галоўнай мэтай было паказаць усю прыгажосць і дынамічнасць баскетбола 3х3, які ўжо праз паўтара года будзе прадстаўлены на II Еўрапейскіх гульнях у Мінску. З задачай арганізатары справіліся.**



За два дні спаборніцтваў тысячы мінчан і гасцей сталіцы ўбачылі захапляльную гульню — цікавыя камбінацыі, хуткія праходы, хітрыя пасы, эфектныя кідкі. Матчы прайшлі ў рэжыме нон-стоп на працягу 9 гадзін у суткі.

Нагадаем, наша сталіца ўжо прымала буйны турнір па гэтым відзе спорту: у 2015 годзе на «Palova-Арэна» адбыўся маладзёжны чэмпіянат Еўропы, тады дзяўчаты са зборнай Беларусі выйгралі сярэбраныя медалі. Гэтым разам турнір быў арганізаваны для хлопцаў.

*— Я задаволены тым, як удалося яго арганізаваць. Вядома, заўсёды ёсць да чаго імкнуцца і куды расці, аднак не магу не радавацца тое, якімі сямімільнымі крокамі развіваецца ў нас у краіне баскетбол 3х3,* — адзначае **старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола Максім РЫЖАНКОЎ.** — *Усяго некалькі гадоў таму ў Беларусі аб гэтым відзе спорту было вядома толькі вузкаму колу спецыялістаў і балельшчыкаў. Цяпер жа ў нас ёсць жаночая і мужчынская нацыянальныя зборныя, якія сфарміраваны сумесна з Міністэрствам спорту і турызму. Менавіта гэтыя дружыны будуць мэтанакіравана рыхтавацца да Еўрагульняў-2019 у Мінску.*

Беларусь на турніры прадставілі адразу 7 камандаў, дзве з іх складаліся пераважна з баскетбалістаў, якія выступаюць у чэмпіянаце Беларусі па класічным баскетболе і з'яўляюцца кандыдатамі ў зборную па баскетболе 3х3, кампанію ім склалі яшчэ 5 аматарскіх дружын. Падапечным галоўнага трэнера Дзмітрыя Калтунова супрацьстаялі моцныя калектывы з Расіі, Літвы, Латвіі і Украіны, усяго ў турніры прынялі ўдзел 16 камандаў.

*— Упершыню за кар'еру давялося гуляць на пляцоўцы, створанай у гандлёвым цэнтры,* — расказвае **гулец латвійскай каманды Ghetto Basket Агніс КАВАРШ.** — *Такі антураж запомніцца на ўсё жыццё, бо гэта нерэальна крута і надае спаборніцтвам дадатковы каларыт. Хачу адзначыць, што арганізацыя турніру была на высокім узроўні, плюс да ўсяго вам удалося сабраць выдатны склад удзельнікаў. Абавязкова прыедзем у Мінск яшчэ раз, калі будзе такая магчымасць, каб зноў паўдзельнічаць у такім неверагодным перформансе.*

У плэй-оф выйшлі па тры лепшыя калектывы з кожнага квартэта. Сярод іх — пяць мінскіх камандаў. Уладальнікам чэмпіёнскага трафея стала дружына Ghetto Basket з Латвіі, якая ў фінале сустрэлася з расійскай камандай «Раснафта».

Адзначым, што пяць беларускіх дружын з сямі прадстаўленых змаглі выйсці ў стадыю плэй-оф і пасапернічаць з еўрапейскімі грандамі. Найлепшага выніку дамаглася каманда «ViM Union», якая заняла 7-е месца, 8-й стала яшчэ адна беларуская каманда «GP TEAM», на 10-м месцы размясцілася «Mr. Magic», на 11-м — БТР, на 12-м — No Names, на 15-м — «Надзея», на 16-м — «Працэс».

*— Добры турнір, у рамках якога нам давялося пагуляць з камандамі высокага класа,* — расказаў **Дзмітрый КАЛТУНОЎ, галоўны трэнер зборнай Беларусі.** — *Хлопцы змагаліся з першых і да апошніх хвілін у кожным матчы і набылі бясцэнны вопыт. Будзем працаваць, наперадзе вучэбна-трэніровачныя зборы, падчас якіх плануем праглядзець многіх баскетбалістаў, якія выступалі на гэтым турніры ў складах іншых беларускіх камандаў.*

*— Атмасфера турніру была «на вышыні». Крута гуляць у закрытым памяшканні, асабліва ў гандлёвым цэнтры. Усе сапернікі былі вельмі моцныя, і гэта вельмі добра. Нават на групавым этапе ні ў кога не было прахадных гульняў,* — адзначыў **Максім ЛЮТЫЧ, гулец каманды БТР, кандыдат у зборную Беларусі па баскетболе 3х3.**

У рамках турніру таксама адбыўся выставачны матч, удзел у якім прынялі ветэраны беларускага баскетбола і зоркі айчыннага шоу-бізнесу. Памятныя сувеніры і ўзнагароды дружынам уручылі міністр спорту і турызму Аляксандр Шамко і старшыня БФБ Максім Рыжанкоў.

# Пяць спартсменаў плюс Б'ёрндален

## БЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЙСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

**У ходзе алімпійскай акрэдытацыі ў Пхёнчхане аргкамітэт вылучыў для Беларусі квоту ў пяць дадатковых месцаў. Дзве «пуцёўкі» вылучаны прадстаўнікам лыжных гонак, тры — канькабежцам, расказаў шэф беларускай місіі Аляксандр БАРАУЛЯ.**

У склад дэлегацыі ўключаны Віталь Міхайлаў (мас-старт), Таццяна Міхайлава (1000 м) і Ксенія Садоўская (500 м) (усе — канькабежны спорт), а таксама Валянціна Камінская, якая выйдзе на старт у спрынце і жаночай эстафеце (лыжныя гонкі).

Такім чынам, на зімовых Алімпійскіх гульнях выступяць 32 беларускія атлеты ў 6 відах спорту. Многія з іх адправяцца ў Пхёнчхан 1 лютага, гэта прадстаўнікі камандаў па лыжных гонках, канькабежным спорце, шорт-трэку, гарналыжным спорце, адміністрацыйная і медыцынская групы.

Пазней стала вядома, што Міжнародны алімпійскі камітэт задаволіў просьбу Беларускай федэрацыі біятлона і выдаў акрэдытацыю знакамітаму нарвежскаму біятлалісту і мужу Дар'і Домрачавай Уле-Эйнару Б'ёрндалену. *«Ён адправіцца ў Пхёнчхан у складзе беларускай дэлегацыі за кошт трэнерскай квоты, якая была ў біятланістаў. Дзякуем МАК, што дапамог нашай федэрацыі, і знакаміты біятланіст будзе прысутнічаць на Гульнях»,* — адзначыў **Анатоль СТРОМСКІ, генеральны сакратар Беларускай федэрацыі біятлона.**

Нагадаем, Уле-Эйнар Б'ёрндален не змог адабрацца ў якасці атлета на сёмую для сябе Алімпіяду ў складзе каманды Нарвегіі. Беларуская федэрацыя біятлона выступіла з ініцыятывай запрасіць біятланіста на Гульні ў складзе беларускай дэлегацыі, каб аказаць дапамогу ў падрыхтоўцы сваёй жонцы Дар'і Домрачавай.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ Гэта мы, Госпадзі...

# ЧАМУ ЗАГІНУЛА ДВУХГАДОВАЯ ДЗЯЎЧЫНКА?

**Абставіны жорсткага забойства ў Слуцку двухгадовай дзяўчынкі зараз высвятляе ўпраўленне СК па Мінскай вобласці. Заведзена крымінальная справа.**

Інфармацыя пра смерць малалетняй з прыкметамі дзеянняў крымінальнага характару паступіла ў праваахоўныя органы ад медыцынскіх работнікаў, якія выязджалі па выкліку. У адным з дамоў у Слуцку медбрыгада і выявіла дзяўчынку ў цяжкім стане са слядамі пабояў. Нягледзячы на праведзеныя рэанімацыйныя мерапрыемствы, яна памерла. Дакладная прычына смерці дзіцяці стане вядомая па выніках экспертызы.

Па падазрэнні ў забойстве заведама малалетняй, здзейсненага з асаблівай жорсткасцю, групай асоб, затрыманы 26-гадовая маці дзяўчынкі і яе сужыцель. Цяпер дапытваюцца родныя, суседзі, збіраецца матэрыял, які характарызуе сям'ю, дзе было яшчэ чацвёра малалетніх дзяцей. Ім аказваецца медыцынская і псіхалагічная дапамога, да правядзення працэсуальных дзеянняў прыцягнуты спецыялісты-псіхолагі і педагогі. Будзе дадзена і прававая ацэнка дзеянням (бяздзеянням) службовых асоб сацыяльных органаў, якія ажыццяўлялі кантроль за ўмовамі пражывання ў сям'і дзяцей.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Беражыце сябе!

# РЫБАЛКУ ДАВЯДЗЕЦЦА АДКЛАСЦІ

**Лёд цяпер смяротна небяспечны на ўсіх вадаёмах.**

Напрыканцы мінулага тыдня маразы ў Беларусі змяніліся адлігай. Дажджы з мокрым снегам, якія ідуць у краіне з панядзелка, не дабаўляюць трываласці ледзяному покрыву на вадаёмах. Таму рыбалка і прагулкі па лёдзе зараз з высокай доляй верагоднасці могуць стаць апошнімі ў жыцці ў літаральным сэнсе гэтага слова.

— Ад ільду, які яшчэ захоўваецца на вадаёмах, засталася фактычна толькі адна назва, — кажа **вядучы спецыяліст рэспубліканскага савета Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА.** — Ён смяротна небяспечны на ўсіх вадаёмах, асабліва на рэках — з-за цячэння. Прагноз надвор'я пакуль несуцяшальны: істотных маразоў, якія маглі б спыніць разбурэнне лёду, у найбліжэйшыя дні не чакаецца. Але адметна, што падчас гэтай адлігі мы не фіксуем смяротных выпадкаў на вадаёмах. Апошняе жыццё лёд забраў яшчэ 18 студзеня. У Гарадоцкім раёне рыбак у поўнай экіпіроўцы праваліўся пад лёд на рацэ Абалянцы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ На слыху

# Судна ў Японскім моры пакуль не знойдзена

## Лёс беларуса — члена экіпажа невядомы

**У Японскім моры прадоўжыліся пошукі рыбалавецкага судна «Усход», якое перастала выходзіць на сувязь з 25 студзеня. Па інфармацыі СМІ, на яго борце быў і наш суайчыннік — 29-гадовы Аляксандр Каранкевіч з Рэчыцы, які колькі часу таму пераехаў на Сахалін.**

Мяркуецца, што судна магло перакуліцца і патануць з-за моцнага ветру. Ратавальнікі знаходзілі пустыя плыты з «Усходу», выратавальныя камізэлькі і іншае з борта, але толькі не членаў экіпажа. Нагадаем, на судне знаходзілася 20 чалавек. З пачатку пошукавай аперацыі ў Японскім моры было абследавана: авіяцыяй — верталётамі і самалётамі — больш за 26 тысяч квадратных кіламетраў акваторыі, марскімі суднамі — больш за 9,7 тысячы квадратных кіламетраў. На жаль, плёну гэта не дало. У нейкі момант пошукі былі спынены, але ўчора кіраўніцтва МНС Расіі па Прыморскім краі аднавіла іх. За дзень авіяцыя МНС абследавала яшчэ больш за 2,3 тысячы квадратных кіламетраў акваторыі. На жаль, зноў безвынікова... На «гарачую лінію» МНС Расіі па Прыморскім краі з пачатку пошукавай аперацыі паступіла 748 званкоў ад родных і блізкіх зніклых, з імі працуюць псіхолагі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Аўто

# Калапс над «Пушкінскай»

## Затор на скрыжаванні Прытыцкага—Пушкіна паралізаваў рух транспарту на некалькі гадзін

**Панядзелак для многіх вадзіцеляў сталіцы стаў сапраўдным выпрабаваннем: на скрыжаванні вуліцы Прытыцкага і праспекта Пушкіна ў 16.30 адключыліся святлафоры, у выніку чаго поўнасцю спыніўся рух аўтатранспарту.**



Значна пацярпеў і грамадскі транспарт: затрымка аўтобусаў і тралейбусаў складала да 50 хвілін. ДАІ падкрэслівае, што любы праезд скрыжавання рэгламентуецца не толькі святлафорамі, але і дарожнымі знакамі і разметкай, якімі вадзіцелі і павінны былі кіравацца. Неабходна памятаць, што **пры заторах забараняецца выязджаць на скрыжаванне, каб не ствараць перашкоды для іншых удзельнікаў дарожнага руху,** аднак гэтым разам многія вадзіцелі папросту праігнаравалі правілы. Як трэба было паводзіць сябе ў такой сітуацыі кіроўцам? «На праспекце Пушкіна выразна бачны знак «Галоўная дарога», а значыць вадзіцелі, якія перасоўваліся па вуліцы Прытыцкага, павінны былі саступіць. З-за таго, што ніхто не стаў гэтага рабіць, і ўтварыўся затор. Калі б першапачаткова пры выключэнні святлафораў вадзіцелі праяўлялі адзін да аднаго цярпенне і ехалі па знаках, гэтага ўдалося б пазбегнуць», — гаворыцца ў звароце ДАІ Мінска. Дарэчы, заўважыўшы такую высокую інтэнсіўнасць руху, гэтае перакрыжаванне лепш было аб'ехаць праз паралельную вуліцу.

Прычына паломкі святлафораў — гэта звычайны збой. Па словах начальніка аддзела агітацыі і прапаганды ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Сяргея Зараніка, было вільготнае надвор'е, ападкі — нешта замкнула, таму святлафоры і адключыліся.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# «Паравозік» на МКАД

**Тут сутыкнуліся фура і пяць легкавікоў. Аварыя адбылася ўвечары на 54-м кіламетры знешняга кальца МКАД.**

Кіроўца грузавога аўтамабіля MAN ехаў з боку праспекта Незалежнасці ў напрамку Лагойскага тракту. З-за незахавання бяспечнай дыстанцыі ён сутыкнуўся з Peugeot, які спыніўся. Ад удару далей як па ланцужку адбыліся сутыкненні з аўтамабілямі Kia, Mazda, Volkswagen і Volvo. Па інфармацыі УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, ніхто не пацярпеў, але аўтамабілі атрымалі сур'ёзныя механічныя пашкоджанні.

# «Фольксвагены» «сышліся» ў лабавую

**Грамадзянін Беларусі пацярпеў у аварыі ў Калужскай вобласці.**

Тут уначы, паводле інфармацыі пасольства Беларусі ў Расіі са спасылкай на зводку ўпраўлення МУС па рэгіёне, на 233-м кіламетры трасы М3 «Украіна» ў Мяшчоўскім раёне адбылося лабавое сутыкненне аўтамабіляў «Фольксваген Гольф» і «Фольксваген Пасат». У выніку аварыі загінулі пяць чалавек, пяцёра атрымалі траўмы. Шпіталізаваны абодва кіроўцы і тры пасажыры «Пасата», сярод іх — і грамадзянін нашай краіны 1978 г. н., у яго пералом лапаткі. У ліку загінулых суайчыннікаў няма. Інфармацыя носіць папярэдні характар, яна ўдакладняецца. У прыватнасці, па тых звестках, што маюцца, «Фольксваген Пасат» меў беларускую рэгістрацыю.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# НЕ ТОЛЬКІ ВЫСОКІ БАЛ АТЭСТАТА...

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

— Таму кожнае прынятае намі летась кіраўніцкае рашэнне абмяркоўвалася з прафесіяналамі, навукоўцамі, педагогамі-практыкамі, Саветам рэктараў, дырэктарскім корпусам, дэпутатамі, грамадска-кансультацыйным саветам, створаным пры міністэрстве, галіновым прафсаюзам, бацькамі навучэнцаў, неабыякавымі грамадзянамі. А найбольш маштабныя праблемы разглядаліся з удзелам кіраўніка дзяржавы на Рэспубліканскім педагагічным савеце і II З'ездзе вучоных, — падкрэсліў міністр. — Закладваючы перспектыўную заканадаўчую базу, мы не забывалі і пра бягучыя пытанні. Так, быў зменены шэраг важных прававых актаў, якія дзейнічалі ў сістэме адукацыі: Палажэнне аб атэстацыі педагагічных работнікаў, аб папячыцельскім савеце, бацькоўскім камітэце і іншыя. Але **галоўнае — нам удалося «разварушыць» сістэму, актуалізаваць яе ролю і месца ў сучасным беларускім грамадстве, намеціць прыярытэтныя кірункі паступальнага развіцця.**

## Курс — на незалежную атэстацыю

Значныя змены адбыліся ў змесце агульнай сярэдняй адукацыі. Летась былі перапрацаваныя навучальныя праграмы па ўсіх прадметах. Выдадзены 41 новы падручнік: іх рыхтавалі з улікам узроставых асаблівасцяў навучэнцаў, заданні насычаны нацыянальным кантэнтам, дапоўнены электроннымі адукацыйнымі рэсурсамі, цікава аформлены. Да 1 верасня 2019 года ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы будуць абноўлены ўсе падручнікі, але маніторынг зместу навучальных праграм, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, унясенне ў іх неабходных карэкціровак будуць працягваецца.

**«Неабходна выключыць непатрэбныя дысцыпліны, якія не маюць дачынення да падрыхтоўкі па канкрэтнай спецыяльнасці».**

— Для павышэння адказнасці навучэнцаў за вынікі вучобы міністэрствам ужо прынята рашэнне аб увядзенні з наступнага навучальнага года нездавальняючых адзнак у V—XI класах: «1» і «2» балы, — паведаміў Ігар Карпенка. — Пакідаць на другі год вучняў з нездавальняючымі гадавымі адзнакамі мы пакуль не плануем. А вось у перспектыве, пасля ўвядзення інстытута незалежнай атэстацыі, якая павінна праводзіцца пры наяўнасці надзейных метадаў ацэньвання, крытэрыяў адкрытасці, празрыстасці і даступнасці інфармацыі, дакладных механізмаў зваротнай сувязі, кожны выпускнік атрымае аб'ектыўны адказ на пытанне, якую траекторыю далейшага навучання яму трэба абраць. Гэта будзе спрыяць павышэнню матывацыі ў выбары будучай прафесіі.

Між іншым, у гэтым годзе беларускія школьнікі ўпершыню будуць удзельнічаць у міжнародным даследаванні адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA (Program for International Student Assessment). Вясной мінулага года ўжо адбыўся пробны этап, які паказаў, што тэхнічна і арганізацыйна Беларусь да даследавання падрыхтаваная.

## Па прафесію — у тэхнапарк

— Для прадастаўлення роўных магчымасцяў у атрыманні якаснай адукацыі прынята прынцыповае рашэнне: экзаменаў у 5-ы клас гімназій больш не будзе, — падкрэсліў Ігар Карпенка. — Прэзідэнтам ужо падпісаны адпаведны ўказ. У сувязі з гэтым нам неабходна распрацаваць комплекс нарматыўных мер па рэалізацыі палажэнняў указа, пачынаючы з падтрымкі таленавітых і адораных навучэнцаў і заканчваючы стварэннем нацыянальнай сістэмы ацэнкі якасці адукацыі. Будуць распрацаваны новыя падыходы ў выніковай атэстацыі выпускнікоў IX і XI класаў, створана рэспубліканская структура па ацэнцы якасці адукацыі ў цэлым. Разам з тым мы выдатна разумеем, што якасць адукацыі — не толькі высокі бал атэстата. Перш за ўсё — гэта паспяхова ўладкаваны ў жыцці чалавек, яго светапоглядны стрыжань і актыўная грамадзянская пазіцыя. Асаблівая роля ў гэтым належыць прафарыентацыйнай рабоце.


Фота БЕЛТА.

Ігар Карпенка паставіў задачу: з наступнага навучальнага года прафесійнай падрыхтоўкай рабочых і служачых на базе ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі павінна быць ахоплена максімальная колькасць вучняў X—XI класаў. Разам з тым патрабуюцца інавацыйныя падыходы ў арганізацыі прафарыентацыйнай работы.

Сёння Міністэрства адукацыі сумесна з вядучымі ўніверсітэтамі прапрацоўвае пытанне арганізацыі дзейнасці дзіцячага тэхнапарка. Работа з адоранымі і таленавітымі дзецьмі павінна быць сканцэнтраваная не толькі на развіцці творчых музычных, артыстычных здольнасцяў, але і матываваць да тэхнічнай творчасці і навуковага пошуку. У сценах дзіцячага тэхнапарка школьнікі змогуць паспрабаваць сябе ў будучай прафесіі, у навуцы, канструяванні і вынаходніцтвах. З гэтай мэтай вывучаўся вопыт суседзяў: дзейнасць у Расіі кванторыумаў і адукацыйнага цэнтра «Сірыус» у Сочы. У Беларусі таксама хапае напрацовак у гэтым кірунку, таму асноўнай задачай цяпер з'яўляецца стварэнне адпаведнай базы.

**«У адной з мінскіх школ ад настаўнікаў патрабуюць справаздачу аб правядзенні канікул навучэнцамі, у іншай — справаздачу аб самаадукацыі».**

Для павышэння прэстыжнасці рабочых прафесій, узмацнення прафарыентацыйнай работы выкарыстоўваецца патэнцыял конкурсу прафесійнага майстэрства WorldSkills. У 2017 годзе беларуская каманда заваявала 2 залатыя, 21 сярэбраны і 6 бронзавых медалёў на Міжнародным чэмпіянаце краін-членаў Еўразійскай прасторы ў Краснадары; 2 медалі — «серабро» і «бронзу» — на нацыянальным чэмпіянаце ў Шанхаі. А на 44-м Міжнародным чэмпіянаце ў Абу-Дабі беларускія канкурсанты занялі 16 месца з 59 краін. Зараз да гэтага руху ў рамках JuniorSkills далучаюцца больш юныя навучэнцы. У бягучым годзе пройдзе ўжо трэці нацыянальны чэмпіянат прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus — 2018.

## Удасканаленне адбору

На ўзроўні вышэйшай адукацыі дзейнасць міністэрства была накіравана летась на аптымізацыю структуры, аб'ёмаў і павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў: уводзіліся новыя спецыяльнасці, змест тэстаў прыводзіўся ў адпаведнасць са школьнай праграмай, абітурыентам прадастаўлялі права здаваць чатыры прадметы на ЦТ, тэрмін дзеяння сертыфікатаў падоўжылі на два гады, а колькасць рэзервовых дзён была павялічана.

**«Будуць распрацаваны новыя падыходы ў выніковай атэстацыі выпускнікоў IX і XI класаў, створана рэспубліканская структура па ацэнцы якасці адукацыі ў цэлым».**

**— Работа над удасканаленнем правілаў прыёму будзе працягвацца і надалей,** — запэўніў міністр. — Я маю на ўвазе павелічэнне парогавага значэння ЦТ, патрабаванні да стажу працы для выпускнікоў школ, якія выбралі завочнае навучанне, гутарку пры прыёме на спецыяльнасці, звязаныя з кіраваннем, замацаванне кампетэнцыі міністэрства на ўвядзенне профільнага іспыту, бо пры залічэнні мы павінны бачыць не толькі балы і лічбы, але найперш чалавека!

Распачата і будзе праводзіцца мэтанакіраваная работа па скарачэнні колькасці незапатрабаваных спецыяльнасцяў і спецыяльнасцяў, якія не адпавядаюць кірунку дзейнасці канкрэтнай ВНУ, узбуйненні і аб'яднанні родных спецыяльнасцяў, увядзенні новых.

Так, у 2017 годзе на першай ступені вышэйшай школы ў сувязі з немэтазгоднасцю падрыхтоўкі былі анулявыны 8 спецыяльнасцяў, 19 кірункаў спецыяльнасцяў і 17 спецыялізацый. На другой — 5. Адначасова было ўведзена 10 і 8 новых спецыяльнасцяў адпаведна.

## Каго рыхтаваць і як?

**Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Васіль ЖАРКО,** які ўзяў удзел у калегіі, паставіў перад сістэмай адукацыі шэраг задач і звярнуў увагу на пытанні арганізацыйнага плана. У прыватнасці, да канца лютага трэба вызначыцца з тэрмінамі навучання ва ўстановах адукацыі Беларусі, незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці і формы ўласнасці.

— Сёння ў адной ВНУ эканамістаў рыхтуюць чатыры з паловай гады, а ў іншай — чатыры гады. Павінен дзейнічаць адзіны стандарт падрыхтоўкі для ўсіх, а палітыку ў гэтым пытанні павінны вызначаць вядучыя профільныя ВНУ, — зазначыў віцэ-прэм'ер. — У краіне мадэрнізуюцца прадпрыемствы, будуюцца новыя, робяцца сур'ёзныя крокі да развіцця лічбавай эканомікі. Падпісаны адпаведны дэкрэт. Нам патрэбны спецыялісты, здольныя працаваць на сучасным абсталяванні, кіраваць складанымі тэхналагічнымі працэсамі. Разам з тым многія ССНУ і ВНУ сёння выпускаюць спецыялістаў учарашняга дня, і, як адзначаюць работадаўцы, іх прыходзіцца давучваць і перавучваць. Сітуацыю трэба ў корані змяніць. Да 1 жніўня неабходна забяспечыць распрацоўку ці дапрацоўку праграмнай дакументацыі па ўсіх узроўнях прафесійнай адукацыі, выключыць непатрэбныя дысцыпліны, якія не маюць дачынення да падрыхтоўкі па канкрэтнай спецыяльнасці. Трэба ўзмацніць практычны складнік адукацыйнага працэсу, асвойваць новыя перспектыўныя кірункі падрыхтоўкі. Навука і тэхналогіі не стаяць на месцы, і сфера адукацыі павінна ісці ў нагу з іх развіццём, а лепш апярэджваць.

Васіль Жарко зазначыў, што не ВНУ будуць вызначаць, каго і колькі ім набіраць на навучанне. Патрэбу ў кадрах будуць фарміраваць Міністэрства працы сумесна з міністэрствамі эканомікі і адукацыі — з улікам патрэб рынку працы, балансу працоўных рэсурсаў і дэмаграфічных прагнозаў. Кожная лічба павінна быць абгрунтаваная.

## Пад персанальную адказнасць

Намеснік прэм'ер-міністра таксама звярнуў увагу на важнасць захавання даступнасці дашкольнай адукацыі на вёсцы.

— У кожным аграгарадку павінен быць дзіцячы сад ці дзіцячы сад — школа. Калі не будзе такіх устаноў, то не будзе ў сяла і будучыні. Вельмі балючае пытанне — закрыццё школ. Такія рашэнні трэба старанна прадумваць, уважліва ўнікаць у кожную сітуацыю, а не гнацца за ўяўнай эканоміяй, трэба гутарыць з насельніцтвам, тлумачыць, пераконваць. Можа, дзесьці ўжо не патрабуецца захаванне базавай школы, дык пакіньце там пачатковую і не вазіце малечу за 15—20 кіламетраў ад дома. Прашу звярнуць увагу: з гэтага года ўсе рашэнні аб закрыцці і рэарганізацыі школ будуць прымацца толькі са згоды міністра адукацыі, і ён будзе несці перад урадам персанальную адказнасць за абгрунтаванасць такіх рашэнняў, — папярэдзіў Васіль Жарко.

**«Міністэрствам прынятае рашэнне аб увядзенні з наступнага навучальнага года нездавальняючых адзнак у V—XI класах: «1» і «2» балы».**

Спыніўся намеснік прэм'ер-міністра і на «праблеме з барадой»: «Шмат гаварылася пра выкананне неўласцівых функцый настаўнікамі, але ў некаторых школах гэта практыка па-ранейшаму захоўваецца, — адзначыў ён. — Здавалася б, прынятая пастанова аб абмежаванні дакументаабароту ў школах, а папяровая валакіта працягваецца. Напрыклад, у адной з мінскіх школ ад настаўнікаў патрабуюць справаздачу аб правядзенні канікул навучэнцамі, у іншай — справаздачу аб самаадукацыі. І такіх прыкладаў шмат, дык пастаўце, нарэшце, кропку ў гэтым пытанні, давядзіце да кожнага дырэктара школы, настаўніка сваю пастанову і забяспечце жорсткі кантроль за яе выкананнем. У такім рэчышчы трэба працаваць і па іншых пытаннях. Вы вызначаеце палітыку ў адукацыі і павінны забяспечыць эфектыўны кантроль за яе рэалізацыяй».

**«Паколькі ацэнку работы школы і настаўнікаў даюць бацькі навучэнцаў, то да іх меркавання трэба абавязкова прыслухоўвацца,** — упэўнены Васіль Жарко. — З верасня школы працуюць па абноўленых вучэбных планах, але ці ўсе пытанні з перагружанасцю вучэбных праграм вырашаны? Думаю, што трэба правесці сустрэчу з бацькамі школьнікаў, выслухаць іх думкі і прапановы і пры неабходнасці ўнесці карэктывы».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Адпачынак па-беларуску

# «...А сані трымаем напагатове!»



## На аграсядзібе каля Аўгустоўскага канала ёсць чым заняцца незалежна ад сезона

**Усяго ў гэтых мясцінах — больш за два дзясяткі гасцявых аб'ектаў. А з увядзеннем бязвізавай зоны пашырылася кола патэнцыяльных турыстаў з-за мяжы. Але ахвотных адпачыць у гэты сезон няшмат. Хіба што на выхадныя завітаюць ці на святы. Карэспандэнт «Звязды» вырашыла высветліць, ці варта наогул траціць нямалыя сродкі, каб адпачыць у аграсядзібе зімой?**

### МЯСЦІНЫ ТУТ СЛАВУТЫЯ...

Цывілізацыя хоць і «прайшлася» па іх, але асцярожна, з розумам. Затое дарогі пакідаюць жадаць лепшага, на іх стан скардзяцца не толькі гаспадары сядзіб, але і госці. Па праўдзе кажучы, пад'езды не паўсюдна дрэнныя. Да самога канала можна даехаць па асфальце, а выбоіны пільнуюць вас на навакольных дарогах. Па іх даводзіцца рухацца з хуткасцю не болей за 5 км у гадзіну. Добра, што такія ўчасткі невялікія, таму з Гродна дабраліся сюды за 50 хвілін. Разам з **гаспадарамі Іосіфам і Наталляй ВЯЛЕНТАМІ** спыняемся каля высокіх драўляных варотаў, за якімі месціцца аграсядзібны комплекс з прыгожай назвай «Анэта». Гаспадар расказаў, што назву даў у гонар сваёй любімай бабулі. Дарэчы, у сядзібе нямала ёе ўласных рэчаў, у тым ліку кросны, калаўрот і прылада для цераблення лёну. Іосіф Іванавіч іх аднавіў і спрабуе наладзіць працэс апрацоўкі лёну для турыстаў.

Турысты ведаюць гэтыя мясціны, бо тут праводзяцца злёты і спаборніцтвы воднікаў. Праўда, многія аддаюць перавагу палаткам, але знаходзяцца і аматары камфорту, якія спыняюцца ў аграсядзібах. Зімой тут прастора для экстрэмалаў. Нямала ахвотнікаў акунуцца ў сцюдзёную ваду пасля парылкі. Рэчка нават у моцныя маразы не замярзае. Пры жаданні можна ўбачыць і баброў, іх тут даволі шмат.

У затоцы яны будуюць хаткі, пра што сведчаць павапленыя дрэвы.

З абодвух бакоў сядзібы знаходзяцца шлюзы Аўгустоўскага канала, у тым ліку самы вялікі — трохкамерны. Тут, на прычале, зімуе цеплаход «Неман» — адно з двух суднаў, якія курсіруюць у цёплы сезон.

Паколькі рэчка не замярзае, сюды прылятаюць лебедзі і качкі. Многія турысты прыходзяць іх пакарміць. Птушкі амаль ручныя, бо браканьераў тут няма, хіба толькі рыбакі пасядзяць з вудай. Кажуць, што можна злавіць нават галаўня і фарэль, якія жывуць толькі ў чыстай вадзе.

### ЗАБАВЫ, АЛЕ НЕ ЗІМОВЫЯ

У гэты час сядзіба выглядае хутчэй па-восеньску. Аб тым, што на календары зімовы месяц, сведчыць хіба што навагодняя ёлка ў цэнтры двара. Дарэчы, упрыгожаныя ялінкі можна ўбачыць паўсюдна. Святкаваць Новы год сюды прыязджалі сем'і гараджан.

— Асабліва ажыятажу на гэтыя святы не назіралася, — заўважае Іосіф Іванавіч, — можа, таму, што дабірацца сюды не вельмі зручна, а яшчэ немалаважны і фінансавы бок. І гэта пры тым, што мы робім зніжкі і наогул не палохаем цэнамі.

Зразумела, што турысты аддаюць перавагу летняму адпачынку, каб скарыстацца поўным спектрам паслуг. Бо наўрад ці хтосьці зацікавіцца дзіцячай пляцоўкай у дажджлівае і халоднае надвор'е. І на шырокіх арэлях няма ахвотных пакачацца. Пляцоўкі для гульні ў футбол ці валейбол таксама больш прыстасаваны для цёплага сезона.



— Быў бы снег — запрэглі б сані, яны ўжо не першы год чакаюць свайго часу, — кажа гаспадар, — у навакольных вёсках можна домовіцца наконт каня. Праехаць у санях па гэтых мясцінах — эмоцый на цэлы год. Вось толькі ці надыдзе такі час?

Для міжсезоння ў сядзібным «аўтапарку» ёсць драўляны вагончык на калёсах, але турысты для шпацыру выбіраюць больш цёплы сезон. Згодна з прагнозам, маразы будуць, але невялікія і не вельмі доўга. Таму Іосіф Іванавіч вырашыў заняцца аднаўленнем свайго «транспарту» — пафарбаваць, падмацаваць, упрыгожыць. Ён лічыць, што зімовы адпачынак можа стаць сапраўды адметным, але толькі са снегам. Тады па-іншаму будзе выглядаць наваколле, прырода, з'явяцца адпаведныя забавы — лыжы, сані.. Углядацца ў агонь, седзячы каля каміна, больш прыемна, калі за вокнамі заснежаны, казачны лес.

### ЦІ ПАЕДУЦЬ ЗАМЕЖНЫЯ ГОСЦІ?

Вядома, гаспадары сядзіб, у тым ліку і Іосіф Вялента, зацікаўлены ў замежных турыстах. І такія магчымасці значна пашырыліся падчас увядзення бязвізавай зоны. Да таго ж побач з аграсядзібай, за некалькі кіламетраў, ёсць беларуска-польскі пункт пропуску, разлічаны на водных, пешых і велатурыстаў. Зразумела, што гэта кірункі летняга сезона, пра што сведчыць і работа пагранпераходу: ён дзейнічае з мая па кастрычнік.

— Сёлета прыток замежных турыстаў значна ўзрос, — заўважыў Іосіф Іванавіч, — пачалі прыязджаць і палякі, і літоўцы. Асабліва многа велатурыстаў. Больш стала і воднікаў. Ужо не рэдкасць замежныя яхты на нашых прычалах, якія плывуць з польскага Аўгустова.

Як высветлілася, у палякаў папулярны так званы настальгічны турызм. Многія прыязджаюць у пошуках сваіх радавых гнёздаў. Некалі тут было шмат хутароў, жыхары якіх з'ехалі ў Польшчу. Зараз іх унукі імкнуцца знайсці хоць рэшткі гэтых дамоў. І, што цікава, нават у лесе знаходзяць фундаменты. А дапамагаюць ім мясцовыя старажылы. Дарэчы, жыхары навакольля таксама актыўна ўдзельнічаюць у турыстычным бізнесе. Напрыклад, Іосіф Іванавіч часта звяртаецца да жанчынкухарак, якія гатуюць ежу для яго замежных гасцей. Новы ўказ пра пашырэнне бязвізавай зоны і павелічэнне тэрміну знаходжання з 5 дзён да 10-ці павінен замацаваць гэтую тэндэнцыю, упэўнены гаспадар аграсядзібы. На яго думку, для развіцця агратурыстычнага бізнесу створаны добрыя ўмовы. І падаткі невялікія, і крэдытам можна скарыстацца.

> Вось і нядаўна быў прыняты ўказ аб пашырэнні дзейнасці: узаконена магчымасць праводзіць на аграсядзібах юбілеяў, вяселляў, карпаратываў. З аднаго боку, турызмам гэта назваць складана, але калі група людзей хоча выехаць за горад, каб адзначыць свята, такая магчымасць у іх павінна быць.

### БЕЗ РЭКЛАМЫ НЕ АБЫСЦІСЯ

Іосіф Вялента не шкадуе, што 10 гадоў таму заняўся агратурызмам. Па-першае, за гэты час на месцы старой развалюхі пабудаваны прыгожы драўляны асабняк, гасцявы дом з лазняй, альтанка з печкай і барбекю. Па-другое, з'явіўся дадатковы даход, які ідзе на развіццё сядзібы. Бізнес, што называецца, выстаяўся. Але як прывабіць турыстаў зімой? Гэтаму, лічыць Іосіф Вялента, трэба вучыцца. І магчымасць такая ёсць. У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце шэсць гадоў таму адкрыта спецыяльнасць «турызм і гасцінннасць». Іосіф Іванавіч, які быў дацэнтам новай кафедры, ездзіў у Калінінград па вопыт. За гэты час падрыхтаваны спецыялісты па рэкламе, палепшыўся сэрвіс. У новых пакаленняў гаспадароў аграсядзіб з'явілася больш магчымасцяў прывабіць турыстаў, у тым ліку ў «нетурыстычны» сезон.

Падарожнічаць можна ў любы час, сцвярджае гаспадар аграсядзібы «Сонічы» Вадзім Сцепанчук. Пакуль ён толькі асвойвае новую справу, але заўважыў, што значную ролю адыгрывае рэклама. Пры гэтым важна, каб вакол аграсядзібы былі цікавыя аб'екты. Пакуль на канале недастаткова інфраструктуры, хаця турыстычныя аўтобусы едуць і зімой. Але далёка не ўсе бачаць сэнс застацца тут нават на некалькі дзён. Таму гаспадарам аграсядзіб варта пашыраць сферу дзейнасці. Вадзім Сцепанчук разглядае прапанову адкрыць кафэ на канале, а пакуль гатовы частаваць турыстаў яечняй і гарбатай, прычым бясплатна. Застаецца дадаць да гэтага ўнікальныя маршруты і краявіды, і адпачынак паціне прыемны след незалежна ад пары года.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

**Дакладна**

Як паведамілі ва ўпраўленні спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама, колькасць аграсядзіб у рэгіёне расце. Калі на 1 студзеня 2017 года іх было 324, то праз паўгода лічба павялічылася амаль на 20. Вырасла і колькасць наведвальнікаў. За 9 месяцаў мінулага года іх было 45,5 тысячы — на 3 тысячы больш за аналагічны перыяд пазамінулага года. Самы «аграсядзібны» раён — Гродзенскі. Тут іх зарэгістравана 80. З сёлетняга года ўсе яны ўваходзяць у бязвізавую зону.

# МАМА БУРАЦІНА



**Лобзік, фрэзер, піла, шрубавёрт... У жаночых руках Юліі МІЦКЕВІЧ са звычайнага кавалка дрэва атрымліваюцца прыгожыя элементы дэкору. Скрыні, крэйдавыя дошкі, кніжныя паліцы, дэкаратыўныя пано. Усё гэта з задавальненнем набываюць як для дарослых, так і для дзяцей.**

— Я сем месяцаў угаворвала мужа падарыць мне лобзік, — усміхаецца дзяўчына. — Пасля першых спроб так балелі рукі... Цяпер, праз тры гады, разумею, што мая работа — гэта своеасаблівы антыстрэс. Няма настрою — пайшла пiліць!

Зараз працоўнае месца ў мінчанкі — на балконе. Але ў планах зараз знайсці ўтульную майстэрню для работы. Дарэчы, Юлія атрымала дзяржаўную субсідыю на арганізацыю рамеснай дзейнасці. На выдзеленыя грошы дзяўчына набыла неабходнае абсталяванне, фарбы.

З радасцю падтрымліваюць справу Юліі і нават падказваюць родныя — сын Павел і муж Віктар.

— Сын — мой першы натхняльнік! — дзеліцца маладая маці. — А муж — першы памочнік, бо менавіта ён падкажа і падтрымае.

— На выставах мужчыны, калі разглядваюць маю прадукцыю, не вераць, што раблю гэта сама, — усміхаецца Юлія. — Але цяпер шмат дзяўчат сталі захапляцца дрэвам! І гэта цудоўна, бо займацца любімай справай — самае важнае ў жыцці.




**Марына БЕГУНКОВА,**
**фота аўтара.**




# КРАН ПАМЫЛАК НЕ ДАРУЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

25 ліпеня аўтакран працаваў на рэканструкцыі былой школы ў Гомелі. Страла крана ў нейкі момант апынулася бліжэй, чым за метр ад лініі электраперадачы, якая знаходзілася пад напружаннем у 10 кілавольт. Невялікі паветраны прамежак паміж дратамі і металічнай стралой быў прабіты электрычным разрадам. Смяротныя траўмы атрымаў дырэктар мясцовага прыватнага прадпрыемства, які быў заказчыкам работ і адначасова з тым ажыццяўляў страпоўку грузу.

Разбіральніцтва выявіла шэраг парушэнняў. Кран не быў зарэгістраваны ў Дзяржпрамнаглядзе. Прычым самае цікавае, што рэгістрацыю ў ДАІ ён прайшоў. Пэўных эксплуатацыйных дакументаў на яго не было. Механізм працаваў у ахоўнай зоне лініі электраперадачы без адпаведнага нарада-допуску. Яго мусіла выдаць арганізацыя, якая абслугоўвала ЛЭП. Ды і сам кран не быў належным чынам заземлены. Больш за тое, на пад'ёмніку адсутнічаў модуль засцярогі ад небяспечнага напружання. Былі выключаны і іншыя агрэгаты, якія адказвалі за электрабяспеку.

Месяцам раней драма разыгралася ў Жлобіне на Беларускім металургічным заводзе. Аператар паста кіравання трубапракатнага цэха выконваў функцыю стропальшчыка. Ён навешваў металічныя стропы на пакет труб. Але... кран яго прыціснуў гэтымі самымі трубамі да агароджы пляцоўкі, дзе ён працаваў.

Тэхніку бяспекі парушыў стропальшчык. Перад тым як кран пачаў падымаць груз, ён мусіў пакінуць небяспечную зону. Але гэтага не зрабіў. Больш за тое, стропы навешваліся ў тым месцы, якое не было прадугледжана тэхналагічнай картай. З-за чаго груз і перакасіла.

**Хто вінаваты?**

Сітуацыя, аналагічная той, якая назіраецца ў Гомельскай вобласці, склалася і ў Мінску. Пры гэтым у 2016 годзе няшчасных выпадкаў і аварый у сталіцы не было зарэгістравана ўвогуле.

— У Мінску ў большасці выпадкаў грузапад'ёмныя краны знаходзіліся ў тэхнічна спраўным стане. Вытворчы траўматызм стаў вынікам нізкай дысцыпліны — адным словам, корань зла трэба шукаць у арганізацыйных прычынах. А яны разнастайныя. Гэта і памылковыя дзеянні, і асабістая неасцярожнасць пацярпелых. Быў выпадак, калі да кіравання і абслугоўвання машын і механізмаў быў дапушчаны персанал, які не меў належнай кваліфікацыі, — расказвае **начальнік упраўлення нагляду за бяспекай пад'ёмных збудаванняў і атракцыёнаў Дзяржпрамнагляда Пётр КЛІМКО.**

У лютым 2017 года цяжкія траўмы атрымаў праходчык Мінскметрабуда. Аўтакран перамяшчаў шчыт апалубкі, які і зваліўся на работніка. Пасля аказалася, што мантаж ажыццяўляўся без кіраўніцтва асобы, адказнай за бяспечнае выкананне работ кранамі. І калі б ён проста зваліўся, але ж у зоне паражэння аказаўся праходчык. А каманду на перамяшчэнне даў стропальшчык.

Ліпень у сталіцы адзначыўся падзеннем вежавага крана на будоўлі комплексу «Мінск-Мір». Цяжкія траўмы атрымаў машыніст. Пасля высветлілася, што разбурылася наземнае мацаванне крана да бетоннага фундамента, на якім і быў усталяваны кран. Ланцужок прывёў да першапрычыны: аказалася, што завод-вытворца дапусціў брак — недастаткова трывала былі звараны швы ў заглыбленнях мацавання.

А напрыканцы кастрычніка няшчасны выпадак адбыўся на адным з прадпрыемстваў Мінска. У грузавік грузілі аўтамабільным кранам жалезабетонныя калодзежы. І раптоўна работу перарваў страшны крык. Зацiснула кіроўцу аўтамабіля, які заадно выконваў функцыю стропальшчыка, паміж паваротнай часткай крана і ўжо пагружанымі калодзежамі.

Тут тэхніку бяспекі парушыў і машыніст, і стропальшчык. Першы паставіў кран вельмі блізка ад кузава і пачаў аперацыю павароту, не ўпэўніўшыся ў тым, што стропальшчыка няма ў небяспечнай зоне. А сам стропальшчык пачаў працу без каманды адказнага за бяспеку.

Смяротная ж аварыя адбылася 4 лістапада на будаўніцтве дома ў цэнтры горада. Вежавы кран уздымаў трансфарматарную падстанцыю. Падчас пад'ёму груз перавярнуўся і збіў электраманцёра, які знаходзіўся ў нябачнай для машыніста зоне. Рабочы зваліўся на перакрыцце паркінга з вышыні трэцяга паверха — васьмі метраў! Пацярпелага даставілі ў бальніцу, але ён неўзабаве памёр. А трагедыя адбылася з-за стропальшчыка. Ён перадаў перагаворную прыладу чалавеку, які не быў абучаны адпаведнай прафесіі...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Выпрабавана на сабе

# Гіпертоніум ад наіву,

## або Як не папасціся на вуду да майстроў падману

**Вакол на сотні галасоў папярэджваюць: не будзьце даверлівыя і прастадушныя, бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы. Але як стрымацца, калі раптоўна табе прапануюць тое, што ты шукаў, ды яшчэ амаль задарма? Прычым з ашуканцамі сустрэцца можна ў самых нечаканых месцах...**

Я, дарэчы, натрапіла на іх у сецібе на вельмі паважаным і вартым даверу партале. Чытала артыкул і бамц — перад вачыма матэрыялізавалася інфармацыя пра лекавы сродак, які дапамагае пазбавіцца ад гіпертаніі раз і назаўжды. Узрост і стаж хваробы значэння не маюць. Сапраўдная панацэя! Адразу ўспомніла ўсіх родных і знаёмых, якія пакутуюць ад павышанага ціску. Тым больш цана прывабная — усяго рубель. Фірма праводзіць акцыю і прапануе прэпарат з трохзначным цэтлікам за капейкі. Водгукі выключна станоўчыя. Усе пішуць, як цудадзейным чынам пазбавіліся ад гіпертаніі і цяпер цешацца з жыцця ў поўнай меры...

Разумныя людзі ў такім выпадку раяць закрыць старонку са словамі: знайшлі дурня. Але жаночая цікаўнасць спакушала: усяго ж рубель. Ну чым я рызыкую, падумалася, і пальцы самі клікнулі — «заказаць». Для сувязі ўпісала мабільны тэлефон, дабрадзей абяцалі звязацца, каб падрабязней расказаць пра прэпарат. Сапраўды, адгукнуліся амаль адразу. Праўда, на той момант размаўляла па мабільніку, не змагла адказаць. Але заўважыла, што спрабуюць дазваніцца з мінскага нумара. Калі пачала пераззваньваць, прыемны жаночы голас паведаміў, што ўсе аператары заняты і павісла працяглая музычная паўза. А праз хвілін пяць мне зноў патэлефанавалі. «Гэта Аляксей», — паведаміў прыемны мужчынскі голас і пацікавіўся, для каго я набываю прэпарат. Ляпнула, што маці. Чуллівы голас папрасіў расказаць, колькі гадоў маёй маці, як доўга яна прымае лекі ад крывянога ціску, колькі яны каштуюць. Незнаёмец шчыра перажываў, што барацьба з хваробай адымае ў маёй маці не толькі сілы, але і вялікую колькасць грошай, шкадаваў, абяцаў выратаваць, зрабіць цуд. «Вы ж змагаецеся з сімптомамі, а ў нас натуральны прадукт», — вяшчаў ён...



На зямлю вярнуў толькі кошт лекаў — 136 рублёў за ўпакоўку. «Дзесяць кропелек тры разы ў дзень праз гадзіну пасля яды на працягу 25—45 дзён — і вы цалкам здаровыя», — абяцаў «ратавальнік» на тым канцы провада і ўжо падсумоўваў: «Чатыры упакоўкі вашай маці хопіць». «Пачакайце, — захвалявалася я. — Размова ішла пра 1 рубель за ўпакоўку. Адкуль 136?» «Так, — пагадзіўся Аляксей, — адзін мы прадаём за поўны кошт, астатнія тры — па рублі». Але я ўжо «працверазела» і рашуча запатрабавала скасаваць маю заяўку. Суразмоўца крыху разгубіўся, але не здаваўся: «Чаму скасаваць? Вы павінны былі больш уважліва чытаць нашы прапановы. Там дробнымі літарамі было напісана, на якіх умовах вам робіцца зніжка». Тэлефонны кансультант змагаўся да апошняга, пазіцыянаваў сябе супрацоўнікам паважанай фармацэўтычнай фірмы, казаў, што цуда-прэпарат вырабляецца на нейкай вельмі аўтарытэтнай фармакампаніі за мяжой краіны, што ў Беларусі яго ў аптэцы не купіш. Ледзь пазбавілася ад надакучлівага прадаўца.

Пасля з лёгкасцю адшукала ў сецібе тую самую паважаную фармацэўтычную фірму, якая рэкламуе сябе на поўную катушку. Ды яшчэ прапануе лекі на кожны выпадак жыцця. І для паляпшэння патэнцыі, і ад пігментных плям, і ад алкагольнай залежнасці, і нават сродкі для амаладжвання. Пра сябе пішуць сціпла: «кампанія створана ў 2011 годзе з мэтай дастаўляць людзям эфектыўныя і даступныя магчымасці для паляпшэння якасці жыцця, прыгажосці і даўгалецця». Зваротная сувязь аднабаковая — разлічана толькі на электронны запыт заяўніка. Фірма актыўна працуе і ў сацыяльных сетках. Яе суполку можна наведаць, напрыклад, «УКантакце» або ў «Фэйсбуку»...

Але ў інтэрнэце знайшлася інфармацыя і пра тое, што фірма нахабна займаецца «разводам» даверлівых грамадзян. Маўляў, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, а таксама Міністэрства аховы здароўя неадназова папярэджвалі, што гіпертоніум ніякім лекавым сродкам не з'яўляецца, што фармакалагічнае дзеянне яго не даказана.

Дзеля інтарэсу патэлефанавала ва ўпраўленне аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама, цікава ж, што наконт гіпертоніума думаюць кампетэнтныя органы. Як растлумачыла **начальнік аддзела арганізацыі спецыялізаванай і першаснай медыцынскай дапамогі Анжэла СТРУНОВІЧ**, гіпертоніум афіцыйна ні ў адзін з пратаколаў лячэння артэрыяльнай гіпертэнзіі не ўваходзіць. Адным словам, гэта і не лекі зусім. «А ваша ведамства нешта робіць для таго, каб неяк абараніць насельніцтва ад гэтых махляроў?» — пацікавілася я, каб усё ж такі высветліць пазіцыю афіцыйнай медыцыны. «Ніякіх указанняў на гэты конт нам з міністэрства не паступала, — адказала спецыяліст. — А вы першая, хто да нас патэлефанаваў з такой прэтэнзіяй».

Калі шчыра, адказ мяне збянтэжыў. Магчыма, трэба было б яшчэ патэлефанаваць у падатковую інспекцыю або ў міліцыю. Але не стала. Гэтыя ж службы і без мяне ведаюць, дзе каго шукаць і з кім змагацца. Адно відавочна, што нехта працягвае паляванне на даверлівых грамадзян і робіць гэта занадта агрэсіўна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ Трагедыя

# АХВЯРЫ АГНЮ

## Узгаранне дывана на пляцоўцы стала прычынай гібелі сям'і ў Лідскім раёне

**Трагедыя разыгралася апоўначы 30 студзеня. Аб моцным задымленні паведаміла жыхарка аграгарадка Пескаўцы. У хуткім часе на месца пажару прыбылі ратавальнікі.**

Як расказала **супрацоўнік абласнога ўпраўлення МНС Наталля ЖЫВАЛЕЎСКАЯ**, пажар адбыўся ў чатырохкватэрным панэльным доме. Падчас прыезду падраздзялення МНС моцнае задымленне назіралася на лесвічнай клетцы і ў кватэры на другім паверсе. Суседка, якая выклікала ратавальнікаў, растлумачыла, што яны з мужам прачнуліся ад сігналу пажарнага апавяшчальніка. Калі ўбачылі, што на лесвічнай пляцоўцы гарыць дыван, сталі яго тушыць. Але дым з пляцоўкі запоўніў адну з кватэр, дзверы якой былі прыадчынены. Увайсці туды суседзі не рашаліся з-за моцнага дыму. Дыван удалося патушыць уласнымі сіламі. Калі ратавальнікі праніклі ў кватэру, яны знайшлі там трох чалавек без прыкмет жыцця. Ахвярамі агню сталі гаспадар кватэры 1957 года нараджэння, яго жонка 1962 г. н. і іх старэйшы сын 1987 г. н. Магчымая прычына ўзгарання — неасцярожнасць пры курэнні.



Як стала вядома, муж і жонка былі ў разводзе. Бацька і сын злоўжывалі алкаголем, стаялі на ўліку ў псіханеўралагічным дыспансеры. У снежні мінулага года ў іх кватэры быў устаноўлены пажарны апавяшчальнік.

Лідскім раённым аддзелам Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь узбуджана крымінальная справа, назначаны шэраг экспертыз па ўстанаўленні ўсіх абставін і вінаватага ў трагедыі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

## Весткі з месцаў

# Вучні выбіраюць кнігу

**З мэтай прапаганды чытання, знаёмства школьнікаў з сучаснай беларускай літаратурай у краіне дзейнічае адмысловы праект «Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі дзецям». У рамках яго ў нашай школе прайшоў конкурс чытальнікаў, прысвечаны творчасці нашага земляка Міколы Чарняўскага, які сёлета адзначае 75-годдзе.**

Адкрывалася мерапрыемства выставай кніг, сярод якіх сваё пачэснае месца занялі зборнікі «Казёл-моднік», «Камар на матацыкле», «На што бабе агарод?», кніжкі паэзіі для дзяцей «Сонца ў хованкі гуляе», «Хто сябруе з добрым днём?», « Аб чым пяе крынічка?», а таксама аповесць «Бегунок пачынае думаць». Ужо нават па назвах кніг можна здагадацца, што творы пісьменніка вылучаюцца сатырай і гумарам, разуменнем дзіцячага свету, сонечным цяплом.

А пачулі б вы, як прыгожа дэкламавалі вершы паэта вучні пачатковых класаў Сафія Даўгацелес, Ягор Харытоненка, Ганна Заброда, Варвара Дзявяткіна, Арына Раман... Кожны хацеў паказаць сваё майстэрства, атрымаць ганаровую грамату.



Пераможцамі ж конкурсу сталі Аляксандра Рудзяк і Марыя Пхідзенка, а таксама Ягор Косцін і Дзмітрый Азаранка.

**Васіль РУДАБЕЛЕЦ,**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры,**
*м. Роўкавічы, Чачэрскі раён*

## Так ці не? Практыкум

# Каму іграць на барабанах?

**«Мы з мужам маладыя бацькі, гадуем маленькую беларусачку, і розных пытанняў у нас узнікае шмат, у тым ліку моўных, — піша наша чытачка Марына з Мінска. — Растлумачце, калі ласка, як правільна казаць: *соска* ці *дунда, падгузак* ці *падгузнік*. Не ведаем мы і як па-беларуску трэба называць тое, у чым возім дачку на шпацыр».**

**Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.**

1. Літаратурная мова складаецца па асаблівых законах і ў яе не заўсёды трапляюць самыя ўжывальныя варыянты слоў. Трапіў туды, напрыклад, *статак*, хоць здаўна бытавала *стада*. Падобная сітуацыя і са словам **соска**. У дыялектах можна сустрэць розныя назвы гэтага прадмета: **сыска, ду́нда, абманка.** Але ў літаратурнай мове замацавалася менавіта *соска*. Гэтым словам карысталіся Максім Танк, Янка Брыль, Іван Шамякін і іншыя. Раім ужываць яго і мы. Сінонім соскі — **пустышка.**

2. Са словамі *падгузак* і *падгузнік* блытаніна і сапраўды ўзнікае часта, і спараджаюць яе слоўнікі. Большасць з іх падае толькі **падгузак**, але некалькі даведнікаў фіксуюць і **падгузнік.** На нашу думку, пажадана аддаваць перавагу аднамоўным слоўнікам. Асноўныя з іх змяшчаюць толькі падгузак. Менавіта яго выкарыстоўвае і «Звязда».

3. Каляскі, на якіх з малечай гуляюць па вуліцы, па-беларуску нетрадыцыйна называць вазкамі. Два прыклады. *У парку паднялася паніка. Маладыя мамы ледзь каляскі не паперакульвалі, уцякаючы* (Павел Місько). *Адтуль на вуліцу высунулася дзіцячая каляска. У ёй сядзеў хлопчык у чырвоным берэціку* (Вячаслаў Адамчык).

Вазок (возік) ва ўнармаванай мове — гэта маленькі воз, у які запрагаюць коней або на якім уручную перавозяць грузы (блізказначнае слова — **тачка**).

Крэсла з коламі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі пабеларуску называюць **інваліднымі каляскамі;** павозкі, якімі карыстаемся ў гіпермаркетах і ўніверсамах, — таксама каляскі.

### У абарону слоў

**Барабаншчык...** Права на існаванне гэтага слова шмат хто гатовы аспрэчваць. Аднак аргументаў у іх няшмат.

З аднаго боку, у літаратурнай мове *бубна́ч* значыць тое, што і *барабаншчык*. Адпаведна ў «музычным» значэнні словы ўзаемазамяняльныя і ўдарніка з рок-гурта можна называць і *барабаншчык*, і *бубнач*.

Дык можа, варта пакінуць толькі апошняга, «бубнача»? Наўрад.

У нашай мове, як у літаратурнай, так і ў народнай, ёсць дзве назвы інструментаў — і барабан, і бубен. Напрыклад, у ілюстраваным «Васьмімоўным даведніку народных інструментаў» Змітра Сасноўскага з кнігі «Гісторыя беларускай музычнай культуры ад старажытнасці да канца XVIII ст.» мы знаходзім абодва інструменты з рознымі выявамі і апісаннямі. Ад назоўніка барабан, зразумела, і паходзіць назва таго, хто на ім іграе.

Такім чынам, у нашай мове ёсць дзве назвы розных інструментаў — барабан і бубен, і дзве назвы музыкаў.

Адпаведнікамі фразеалагізма **адстаўной казы барабаншчык** (чалавек, не варты ніякай увагі) з'яўляюцца **ад пустой бочкі затычка, усадзіў бог душу ні ў пень ні ў грушу...**

## Свой погляд

# КАБ ПОМНІЛІ...

**Кнігі з памятнымі, дароўнымі надпісамі сустракаюцца ў многіх бібліятэках — нават хатніх. Ёсць яны (больш за 50 асобнікаў) і ў нашым краязнаўчым музеі. Асобныя — перадалі самі аўтары, іншыя прыносілі іх сваякі ці проста чытачы, якім не абыякавы лёс кнігі.**

Большасць аўтографаў носіць павучальны характар. Удзельнік вызвалення Клімаўшчыны Міхаіл Данілавіч Максімцоў у кнізе «Дарогамі мужнасці» пакінуў, напрыклад, просьбу-наказ музею: «Прашу прыняць на вечнае захоўванне маю сціплую працу... Хай цяперашняе і будучыя пакаленні ведаюць пра тых, хто абараніў свет, шчасце, камунізм. Аўтар».

Самы стары подпіс з нашай калекцыі датаваны жніўнем 1945-га. Яго зрабіў Антон Бялевіч у сваім



зборніку паэм і вершаў «Чалавек з дубровы», які прэзентаваў прыяцелю маёру Паўлу Кавалёву.

Сваё даследаванне «Арганізатарская работа камуністычнай партыі ў вёсцы (1918—1920 гады)» перадаў у музей Герой Савецкага Саюза, прафесар Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі, які быў ураджэнцам в. Барысавічы. За сваё доўгае жыццё ён напісаў больш за 200 прац па гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны...

Каштоўнымі экспанатамі з'яўляюцца кніга пісьменніка Віталя Вольскага «Чайкі над Нараччу» з дароўным надпісам нашаму земляку Паўлу Нічыпаравічу Кавалёву, а таксама праца нашай зямлячкі, члена Камуністычнай партыі з 1920 года, прафесара Ганны Георгіеўны Ліпкінай «1919 год у Сібіры» з аўтографам аўтара.

Свае радаводы з памятнымі надпісамі прэзентавалі музею Рыгор Барысавіч Чамаданаў і Мацвей Георгіевіч Закалінскі.

А таму калі ў рукі да вас трапіць кніга з памятным надпісам, падумайце, магчыма яе таксама варта захаваць для нашчадкаў?

**Уладзіслаў МІЦІЧАЎ,**
**старшы навуковы супрацоўнік Клімавіцкага краязнаўчага музея**

## Чалавек — чалавеку

# «...ЯК МАЛА ДЗЕЦЯМ ТРЭБА»

**Воўчыка ў вёсцы ведалі ўсе. На жаль, не з лепшага боку. «Ай, алкаголік», казалі пра яго за вочы. Але ж Воўчык так не лічыў. «Я проста п'яніца, — лічыў ён і нават даводзіў розніцу: маўляў, алкаголік — чалавек, можна сказаць, кончаны, бо залежны: ён хоча п'е, і не хоча — таксама п'е. А п'яніца — ён можа і адмовіцца.»**

Шкада толькі, што з гадамі ў жыцці Воўчыка гэта здаралася ўсё радзей і радзей. Амаль штовечар, паставіўшы на «прыкол» трактар і набраўшыся нейкай гары, ён завальваўся дома спаць. І гэта яшчэ за шчасце было, бо той гары «недабраўшы», ён кідаўся да ўсіх з кулакамі, і найбольш тады перападала дзецям ды яго пакутніцы-жонцы...

Раніцай на святую Тройцу Воўчык атрымаў зарплату. Па старой завядзёнцы на чужыя жывыя грошы тут жа сталі злятацца «сябры», і ўжо віліся вакол, як тое камар'ё, бо ведалі: Воўчык — ён заўсёды нальё, ён (асабліва — пасля трэцяй...) нікому не адмовіць, не будзе зацісказь капейку.

Гэтым разам яны трохі памыліліся. Да першага верасня Воўчык абяцаў малым, што заробіць на новую школьную форму, і пра гэта на цвярозую галаву яшчэ помніў. А таму адышоў за рог крамы, ва ўнутраную кішэнь пінжака крадком адлажыў частку грошай. Ды яшчэ і на гузічак зашпіліў...

Колькі потым прапіў, сам дамоў прывалокся ці яго хто прынёс, ужо не помніў.

Прачнуўся на сваёй канапе ад звычнай лаянкі. Краем вока ўбачыў, што жонка зайшла ў хату з нейкім прутам, чуў, як гразілася, што заб'е ці хоць бы аддубасіць — душу адвядзе... Цешча — дзякуй — спыніла: сказала, што з гэтага толку не будзе. Няхай праспіцца, маўляў, потым разбярэшся.

Гэтых жончыных разборак Воўчык, па праўдзе, не дужа баяўся, ён проста звягі не любіў. А таму вырашыў, што зараз, калі бабы сыдуць з хаты, найлепей было б на стол ім пакласці грошы, а самому змыцца.

Аднак што гэта? Воўчык сунуў руку ў кішэнь — скрутка там... не было. Няўжо прапіў? Ці можа хто выцягнуў?

Ён яшчэ раз абмацаў адзенне і абутак, потым агледзеў усе свае патаемныя схованкі на гарышчы, у склепе, у пуні... Пазваніў сябру, з якім пачыналі выпіўку, спытаў, хто яго давалок дадому? Той адказаў, што Воўчык пайшоў сам... Выходзіла, што грошы трэба шукаць дома?

Ён зноў узяўся за пошукі, а ўрэшце, амаль страціўшы надзею знайсці ды ўявіўшы вочы дзяцей, укленчыў перад іконай Божай маці і, як сваёй роднай, сказаў:

— Ну, не мог я столькі прапіць! Малю цябе, прасвятая Багародзіца, дай мне розуму — падкажы, куды я грошы паклаў?

Спытаў гэтак, паглядзеў на яе і быццам пачуў: «За мной... Паглядзі за мной...»

Воўчык тут жа падсунуў крэсла, ускочыў на яго, заклаў руку за абраз і ледзь не самлеў ад шчасця: яго, скручаныя ў трубачку «паперкі» ляжалі там.

— Дзякуй табе! — пацалаваўшы абраз, сказаў Воўчык.

А ўжо потым зрабіў, як задумаў: на кухонны стол, жонцы на вочы паклаў захаваную суму і ўцёк з хаты.

...Начаваць не прыйшоў (сорамна было).

Такое і раней здаралася, але ж сям'я хвалявалася ўсё роўна. «Ці не бачыў хто майго п'яніцу?», — прапытвала ў людзей жонка, дзеці вочы праглядзелі, шукаючы і чакаючы.

А таму, калі пад вечар наступнага дня ён, вінаваты, няголены, учарнелы (поле араў на тарфяніках) заявіўся на вуліцы, малыя закрычалі:

— Мама, наш татка ідзе! Свята! Свята ў нас!.. Ён сёння цвярозы!..

Дзеці абдымалі яго, ён абдымаў іх, і ў яго стомленых мазгах маланкай бліснула думка: «Як жа мала дзецям трэба для свята: каб бацька прыходзіў дамоў цвярозы».

— Слова даю, — сказаў ім, — піць болей не буду.

— Ага... Паверылі, — яму ў адказ цяжка ўздыхнула жонка. — Ты сваё слова трынаццаць гадоў даеш ды назад забіраеш.

— Зараз — не забяру! Гадам буду! — цвёрда прамовіў муж.

Назаўтра ён узяў адгул і ўсё ж з'ездзіў да нарколага.

...Пасля таго візіту прайшло амаль 20 гадоў. Валодзя, ён жа Іванавіч (Воўчыкам больш ніхто не заве) не п'е і п'яніц не любіць. Але ж дапамагла яму не столькі праславутая кадзіроўка, колькі асабістае жаданне жыць чалавекам ды ўласная сіла волі.

**Ніна БУРКО.**
*Бярэзінскі раён*



Адукацыя

# DO YOU SPEAK ENGLISH?

## Беларускія міліцыянеры змогуць не толькі адказаць на гэтае пытанне, але і працягнуць дыялог

**Сталіца актыўна рыхтуецца да правядзення II Еўрапейскіх гульняў летам 2019 года: будуюцца і рэканструююцца спартыўныя аб'екты, гатэлі, уладкоўваюцца зоны гасціннасці. Працэс падрыхтоўкі закранае прадстаўнікоў розных структур, актыўна задзейнічаных у жыцці горада, у тым ліку і супрацоўнікаў міліцыі. Акрамя адпрацоўкі методык забеспячэння грамадскай бяспекі ў месцах масавага збору людзей асаблівая ўвага ўдзяляецца ўдасканаленню ўзроўню валодання англійскай мовай. Аб правядзенні адпаведных заняткаў расказаў начальнік аддзела прафесійнай адукацыі ўпраўлення прафесійнай падрыхтоўкі галоўнага ўпраўлення кадраў МУС Дзмітрый МАЗАНІК.**



Фота прэс-службы МУС.

***— Дзмітрый Валер'евіч, супрацоўнікі якіх падраздзяленняў будуць праходзіць падрыхтоўку?***

— Правядзенне ў Мінску ў 2014 годзе чэмпіянату свету па хакеі выявіла неабходнасць больш глыбокага ведання замежных моў супрацоўнікамі вонкавых службаў. Таму асноўны кантынгент слухачоў гэтых курсаў — супрацоўнікі падраздзяленняў міліцыі грамадскай бяспекі, у тым ліку Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі, Дэпартамента аховы, а таксама прадстаўнікі ўнутраных войскаў МУС, якія будуць непасрэдна ўдзельнічаць у забеспячэнні грамадскай бяспекі ў перыяд правядзення II Еўрапейскіх гульняў. Таксама варта адзначыць, што кіраўнікі згаданых падраздзяленняў МУС таксама накіраваныя ў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт для ўдасканалення навыкаў моўных зносін з замежнымі гасцямі.

***— Якія крытэрыі адбору былі для кандыдатаў?***

— На згаданыя курсы накіроўваюцца супрацоўнікі і вайскоўцы, якім неабходна павысіць узровень валодання замежнай мовай, бо і ў паўсядзённай службовай дзейнасці яны непасрэдна кантактуюць з замежнымі грамадзянамі. Варта падкрэсліць, што ўсе навучэнцы папярэдне праходзяць уваходнае тэсціраванне, па выніках якога фарміруюцца навучальныя групы.

***— Як доўга будуць доўжыцца курсы?***

— Гэтыя спецыяльныя моўныя курсы праводзяцца на працягу трох месяцаў і арганізаваны, пачынаючы з 2017 года, у чатыры этапы, апошні з якіх скончыцца ў першым квартале 2019 года.

***— Колькі чалавек павінны паспець прайсці навучанне?***

— На кожным этапе навучаецца 100 супрацоўнікаў і ваеннаслужачых, 75 — у Акадэміі МУС і 25 — у Магілёўскім інстытуце МУС. Такім чынам, да пачатку правядзення II Еўрапейскіх гульняў установамі вышэйшай адукацыі МУС будзе падрыхтавана 400 чалавек.

Адначасова прапрацоўваецца пытанне аб магчымасці навучання супрацоўнікаў вонкавых службаў УУС абласканкамаў на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, размешчаных у адпаведных рэгіёнах.

***— Хто праводзіць курсы?***

— Навучальныя занятткі са слухачамі праводзяць спецыялісты, якія маюць адпаведную кваліфікацыю і вопыт работы на аналагічных курсах падчас падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года. Гэта выкладчыкі ўстаноў вышэйшай адукацыі МУС, а таксама прадстаўнікі аддзелаў міжнароднага супрацоўніцтва згаданых устаноў.

***— Для навучання распрацоўвалася спецыяльная праграма?***

— Вучэбна-праграмная дакументацыя для правядзення курсаў была распрацавана на кафедры беларускай і замежных моў Акадэміі МУС з улікам спецыфікі выконваемых задач падраздзяленнямі ўнутраных спраў.

***— Якім навыкам і тэмам пры падрыхтоўцы надаецца асаблівая ўвага?***

— Галоўная задача такіх курсаў — навучыць супрацоўнікаў і ваеннаслужачых весці дыялог з замежнымі грамадзянамі па розных пытаннях, якія могуць у іх узнікнуць падчас наведвання Беларусі. У гэтай сувязі вывучаюцца тэмы, звязаныя з пытаннямі пабудовы канструктыўнага дыялогу з замежнымі грамадзянамі, арыентавання іх да месцаў правядзення спартыўных спаборніцтваў і культурна-масавых мерапрыемстваў, аказання неабходнай дапамогі ў выпадку непрадбачаных сітуацый.

Як расказалі ў Магілёўскім інстытуце МУС, каб максімальна ўніфікаваць праграму, кансультаваліся з калегамі з Акадэміі МУС. Яны ж падказалі тэмы, але дыдактыка і пазаўрочныя матэрыялы — выключна ўнутраная распрацоўка. Некаторыя заданні ўзялі з адкрытых крыніц, у тым ліку з расійскіх выданняў, падрыхтаваных да Алімпіяды ў Сочы. Нямала цікавага знайшлі і ў замежных рэкамендацыях. А тэмы, якія датычацца канструкцый аўтамабіляў і арыентавання ў горадзе, адлюстраваны ў праграмах перападрыхтоўкі, якую штогод у інстытуце праходзяць супрацоўнікі ДАІ. Прычым дыдактычны матэрыял будзе карэкціравацца з улікам узроўню канкрэтнай групы і нават чалавека.

У навучанні ўпор робіцца на разбор сітуацый, якія могуць паўстаць пры штодзённым нясенні службы. Слухачы адпрацоўваюць тэмы «Апісанне знешнасці», «Афіцыйнае прадстаўленне супрацоўніка праваахоўных органаў замежным грамадзянам», «Праверка дакументаў», «Аказанне дапамогі ў выпадку няспраўнасці аўтамабіля», «Парушэнне грамадскага парадку», «Допыт падазраванага і апытанне сведкі» — усяго іх 25.

— Нам важна навучыць у пэўнай сітуацыі ўжыць патрэбную фразу, а вось граматычна дакладнай яе пабудове і фанетычным асаблівасцям прамовы з-за абмежаванай колькасці гадзін удзяляем менш увагі. На факультэтах замежных моў спецыялізаваны ўводна-фанетычны курс пры штодзённых занятках доўжыцца некалькі месяцаў. На жаль, такога сабе дазволіць не можам. Таму выпраўляем слухача, калі няправільна вымаўлены ім гук змяняе сэнс слова. Для нас важна, каб супрацоўнікі не толькі ўмелі сфармуляваць сваю думку, але і зразумець адказ. Каб настроіць слых на ўспрыманне англійскага маўлення, выкарыстоўваем аўтэнтычныя аўдыё- і відэаматэрыялы з адкрытых крыніц, — адзначыў **выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Магілёўскага інстытута МУС Уладзіслаў БАЛАБАНАЎ.**

**Дар'я КАСКО**

Хронікі

# ПЕРШЫЯ МІЛІЦЭЙСКІЯ

## Як рыхтавалі супрацоўнікаў міліцыі ў даваенныя гады

**У гісторыі міліцэйскай адукацыі Беларусі ёсць знакавая падзея, якая да сённяшняга часу застаецца малавядомая. Менавіта ад яе пачаўся адлік прафесійнага міліцэйскага навучання ў нашай краіне. У 1921 годзе былі арганізаваны першыя курсы для падрыхтоўкі супрацоўнікаў міліцыі — «для каманднага складу Міліцэйскай службы пры Галоўным упраўленні рабоча-сялянскай міліцыі ССРБ».**

Арганізацыя міліцыі ў Беларусі як пастаяннага штатнага дзяржаўнага органа, пабудаванага на прафесіянальнай аснове, фактычна пачалася з восені 1920-га, пасля пераходу рэспублікі да мірнага будаўніцтва са стварэннем паўнавартаснай сістэмы бальшавіцкіх органаў улады і кіравання. Бо, як вядома, у 1917—1920 гадах на тэрыторыі Беларусі не сціхалі ваенныя дзеянні. Таму відавочна, што арганізацыя міліцыі ў Беларусі ў гэты час мела непастаянны характар і адбывалася на тэрыторыях, дзе часова ўсталёўвалася савецкая ўлада.

Стварэнне штатнага прафесіянальнага апарату савецкай міліцыі, якое разгарнулася ў 1921 годзе, безумоўна, патрабавала высокапрафесійных кадраў. Пытанне іх падрыхтоўкі разглядалася 13 сакавіка 1921 года на пасяджэнні калегіі Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС) ССРБ. (Як вядома, Галоўнае ўпраўленне рабоча-сялянскай міліцыі (Галоўміліцыя) ССРБ на правах самастойнай структурнай адзінкі ўваходзіла ў склад рэспубліканскага НКУС.) Калегія прымае рашэнне аб адкрыцці курсаў па перападрыхтоўцы міліцыянераў.

27 ліпеня 1921 года з'яўляецца гістарычны загад № 83с, падпісаны выконваючым абавязкі начальніка Галоўміліцыі ССРБ Філіпам Варганавым і начальнікам палітсакратарыята Галоўміліцыі Леанідам Лявонавым і зацверджаны наркамам унутраных спраў Язэпам Адамовічам. Ён быў прысвечаны арганізацыі пастаянных «курсаў каманднага складу Міліцэйскай службы пры Галоўным упраўленні рабоча-сялянскай міліцыі ССРБ». У дадатках да загада былі зацверджаны: Палажэнне аб курсах, план і праграма, расклад заняткаў і штаты. Іх планавалася адкрыць не пазней 15 жніўня 1921 года, але фактычна яны пачалі працаваць у кастрычніку. Як вынікае са справаздачных дакументаў аб дзейнасці міліцыі Беларусі за 1921 год, набор курсантаў пачаўся 15 верасня.

Курсы былі чатырохмесячныя, але «ў сілу распараджэння начгалоўміліцыі з прычыны крайняга недахопу камскладу міліцыі» першы датэрміновы выпуск курсантаў адбыўся ўжо ў студзені 1922-га. У гэтым жа годзе на базе курсаў ствараецца першая адукацыйная ўстанова для прафесійнай падрыхтоўкі кадраў міліцыі — школа міліцыянераў пры Галоўміліцыі ССРБ, якой у 1925 годзе прысвоілі імя першага начальніка Мінскай народнай міліцыі М. В. Фрунзэ *(далей — школа)*. Школа дзейнічала ў 1920—1930-х гадах. У другой палове 1920-х яна афіцыйна называлася «міліцэйская школа пры Упраўленні міліцыі і крымінальнага вышуку НКУС БССР», або «школа міліцыі імя Фрунзэ» (назвы засведчаныя на афіцыйных штампах гэтай установы). З 1923 па 1930 год школа выпусціла больш за 500 супрацоўнікаў малодшага каманднага складу міліцыі. З 1931 года перайшла на падрыхтоўку сярэдняга начальніцкага складу.

Сёння ў Мінску захаваўся будынак, у якім месцілася першая міліцэйская школа Беларусі. Ён знаходзіцца на праспекце Машэрава, якраз насупраць Акадэміі МУС, якая ў навучальным аспекце фактычна з'яўляецца пераемніцай згаданай школы. Пры гэтым варта заўважыць, што афіцыйная дата, з якой вядзе свой пачатак Акадэмія: 16 мая 1958 года — дзень стварэння Мінскага аддзялення завочнага навучання Вышэйшай школы МУС СССР, не ў поўнай меры адпавядае гістарычным рэаліям. Дата 27 ліпеня 1921 года ў большай ступені заслугоўвае быць сапраўднай датай нараджэння Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, паколькі менавіта з яе пачалося сапраўднае прафесійнае навучанне асабовага складу беларускай міліцыі.




Штамп Міліцэйскай школы пры Упраўленні міліцыі і крымінальнага вышуку НКУС БССР.

**Юры КУР'ЯНОВІЧ**

■ Тэма

# Працяг «бязвізу» і пагадненне з Расіяй

## Што сёлета зменіцца ў міграцыйнай палітыцы?

**Аб новаўвядзеннях, якія датычацца гэтай сферы, расказаў начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Аляксей БЯГУН.**

### Падрыхтоўка да глабальных спартыўных падзей

Адным з найважнейшых пунктаў павінна стаць уступленне ў сілу пагаднення Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй аб узаемным прызнанні віз ужо ў першым квартале гэтага года. Гэта звязана, у першую чаргу, з буйнымі спартыўнымі мерапрыемствамі: чэмпіянатам свету па футболе, які мае адбыцца ў Расіі гэтым летам, а таксама II Еўрапейскімі гульнямі і чэмпіянатам свету па хакеі, якія пройдуць на тэрыторыі Беларусі ў 2019 і 2021 гадах адпаведна. Да першай спартыўнай падзеі на тэрыторыі дзвюх дзяржаў будзе створана рабочая група экспертаў, якія абмяркуюць рэжым перамяшчэння замежных грамадзян на матчы і транзітны праезд праз Беларусь. У перспектыве тая ж практыка распаўсюдзіцца на наступныя спартыўныя мерапрыемствы.

Само пагадненне заклікана ўмацаваць узаемадзеянне праваахоўных органаў дзвюх краін і павысіць эфектыўнасць ажыццяўлення міграцыйнай палітыкі. Пасля прыняцця пагаднення і іншых спадарожных дакументаў па кароткатэрміновым знаходжанні замежных грамадзян на тэрыторыі Беларусі і Расіі кампетэнтныя органы дзвюх краін наладзяць абмен інфармацыяй у анлайн-рэжыме аб выдадзеных і ануляваных візах: з'явяцца новыя інфармацыйныя банкі даных, што будзе спрыяць больш сугладнай рабоце праваахоўнікаў, прагназаванню міграцыйных патокаў, іх аналізу і выпрацоўцы адпаведных кіраўніцкіх рашэнняў.

Па словах эксперта, спецыялісты дзвюх дзяржаў і зараз перыядычна абменьваюцца спісамі асоб, якія ў сілу розных абставін парушылі нормы заканадаўства. Прычым, у спісы ўключаюць не толькі парушальнікаў, але таксама тых людзей, уезд або знаходжанне якіх на тэрыторыі саюзнай дзяржавы забаронены ці непажаданы.

### Асноўнае парушэнне — памылка ў падліках

Усяго за мінулы год па «бязвізе» Беларусь наведала каля 80 тысяч замежнікаў з 65 дзяржаў. Больш за ўсё гасцей з Германіі — 12,7 тысячы чалавек, Польшчы — каля 7,6 тыс., Італіі — 6,7 тыс. За ўвесь час дзеяння рэжыму зарэгістравана каля 500 парушэнняў. Па словах начальніка дэпартамента, падобныя лічбы асцярог не выклікаюць:

— Мы ўзмацнілі інфармацыйную работу сярод тых асоб, якія знаходзяцца на тэрыторыі нашай дзяржавы, у аэрапорце размясцілі два білборды, дзе на пяці мовах змяшчаецца інфармацыя аб асноўных аспектах знаходжання ў нашай краіне, падобная інфармацыя размешчана на ведамасным сайце МУС.

У асноўным парушаюць заканадаўства грамадзяне Еўразійскага эканамічнага саюза, якія допускаюць нязначныя адступленні ад правілаў, звязаныя з рухам па тэрыторыі сумежных дзяржаў. Беларускія праваахоўнікі даволі лаяльныя да такіх парушэнняў, і, як правіла, абмяжоўваюцца штрафамі альбо папярэджаннямі. Да злосных парушальнікаў прымяняюцца больш сур'ёзныя санкцыі, аж да дэпартацыі і забароны на ўезд.

Каб змена рэжыму ўезду ў краіну не паўплывала на ўзровень бяспекі, папярэдне была праведзена вялікая сумесная работа ўсімі кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі. Дарэчы, раней пры атрыманні беларускай візы замежнік падаваў аб сабе шырокі спектр інфармацыі, якія з дапамогай інфармацыйных рэсурсаў быў даступны праваахоўным органам. Цяпер жа пры ўездзе ў краіну дастаткова прадставіць толькі пашпартныя звесткі пры запаўненні міграцыйнай карты. Такім чынам у краіну прыбывае штодня каля 1,5 тысячы замежных грамадзян. Гэта істотная колькасць людзей, якія могуць паўплываць на ўзровень правапарушэнняў, як для Мінска ў прыватнасці, так і для краіны ў цэлым. Таму супрацоўнікам міліцыі даводзіцца ўвесь час быць напагатове: у выпадку неабходнасці правесці тлумачальную гутарку, прыцягнуць да адказнасці.

— Часам даводзіцца растлумачваць правілы паводзін у грамадскіх месцах, расказваць пра забарону распівання спіртных напояў. Некаторыя забываюць, што першымі суткамі знаходжання лічыцца дзень перасячэння дзяржмяжы, тым самым парушаючы дапушчальныя тэрміны. Гэта самае распаўсюджанае парушэнне сярод такой катэгорыі асоб, — адзначыў Аляксей Бягун.

Дарэчы, новаўвядзенні закрануць і рэгістрацыю замежнікаў. З красавіка паслуга рэгістрацыі замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ў Беларусі, стане даступнай праз адзіны партал электронных паслуг. Планавалася, што опцыя з'явіцца да канца 2017 года, але пакуль замежнікі, у якіх няма плацежных карт беларускіх банкаў, па тэхнічных прычынах не могуць аплаціць дзяржаўную пошліну ў АРІП без асабістага звароту ў банкі. Зараз жа прапрацоўваецца пытанне аб вызваленні замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ў Беларусі, ад выплаты дзяржаўнай пошліны пры рэгістрацыі ў электроннай форме ■

■ Супраць наркотыкаў

# ЗВЯРТАЙЦЕСЯ — І ВАМ POMOGUT.BY




**Запушчаны новы інфармацыйны рэсурс дапамогі наркazалежным і іх блізкім**

**Ініцыятарам яго стварэння выступіла Міністэрства ўнутраных спраў. Спецыялісты прааналізавалі ўсю наяўную інфармацыю, якая датычыцца аказання дапамогі наркazалежным і сузалежным, і прыйшлі да высновы, што яна вельмі разрозненая і цяжкая для ўспрымання. Тады было прынята рашэнне аб'яднаць і сістэматызаваць усе звесткі на адным партале.**

**Міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ** прадставіў ініцыятыву на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, дзе яна была ацэнена як перспектыўная. Прэзентаваны ж праект быў раней, на міжведамаснай нарадзе, прысвечанай супрацьдзеянню распаўсюджванню наркотыкаў.

Тым часам **начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Генадзь КАЗАКЕВІЧ** адзначыў, што Міністэрства ўнутраных спраў даўно сышло ад толькі карнай паліцэйскай методыкі процідзеяння наркапагрозе. Галоўны паказчык зараз — не колькасць зарэгістраваных злачынстваў, а колькасць выяўленых злачынных груп, якія займаюцца менавіта збытам. І гэта працуе: у параўнанні з 2016-м у Беларусі летась на 45 % менш зафіксавана выпадкаў перадазіровак, а сярод падлеткаў гэты паказчык упаў увогуле ў дзевяць разоў. Да таго ж з 2015 года не дапушчана ні аднаго смяротнага зыходу непаўналетніх пасля атручвання псіхаактыўнымі рэчывамі. Штогод таксама памяншаецца колькасць наркazалежных, якія стаяць на дыспансерным або прафілактычным уліку. Увогуле за апошні год адбылося зніжэнне наркazлачыннасці на 14,6 %. Аднак, на думку кіраўніка падраздзялення, метады прафілактыкі наркаманіі і папярэджання наркazлачынстваў пакуль малаэфектыўныя.

— Калі мы пагутарылі з наркazалежнымі, спецыялістамі, прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый, то прыйшлі да высновы, што масівы інфармацыі аб праблеме наркаманіі, якія сёння даступныя для людзей, занадта разрозненыя. У гэтай сувязі МУС выступіла ініцыятарам стварэння новага інфармацыйнага рэсурсу, які будзе арыентаваны на паўную аўдыторыю — залежныя і сузалежныя, дзеці і падлеткі, проста неабыякавыя грамадзяне. Інфармацыйны рэсурс зможа ў рэжыме рэальнага часу — шляхам тэлефоннай гутаркі або інтэрнэт-перапіскі — забяспечыць кожнага чалавека ведамі па яго канкрэтнай праблеме. Такім чынам мы выводзім прафілактыку і папярэджанне на якасна новы ўзровень, — адзначыў Генадзь Казакевіч.

Спецыфіка гэтай праблемы ў тым, што многія не лічаць магчымым звярнуцца па параду да знаёмых, бо стаўленне да гэтай тэмы ў грамадстве, хутчэй, адмоўнае. Менавіта таму адно з правілаў рэсурса — захаванне поўнай ананімнасці. Цяпер на сайце pomogut.by сабраны некалькі дзясяткаў як дзяржаўных, так і прыватных клінік і цэнтраў, у якія можна звярнуцца па дапамогу. Інфармацыя пастаянна актуалізуецца, даведаўшыся аб запуску новага праекта, некаторыя ўстановы самі выступілі з ініцыятывай быць занесенымі ў спіс.

Як расказала **намеснік начальніка ўпраўлення галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Кацярына ШЭЛЕГАВА**, атрымаць кансультацыю можна будзе не толькі анлайн, у хуткай будучыні на базе Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей будзе створаны кантакт-цэнтр. Там будуць працаваць прафесійныя псіхолагі, з якімі МУС правядзе спецыяльную падрыхтоўку па прававых пытаннях. Зараз жа пры ўдзеле супрацоўнікаў ведамства вырашаюцца апошнія арганізацыйна-тэхнічныя моманты перад адкрыццём цэнтра. Праект актыўна падтрымліваюць таксама Міністэрства адукацыі і Міністэрства аховы здароўя. Калі першая частка будзе рэалізаваная паспяхова, у планах — развіваць яшчэ два кірункі: прафілактычную работу з падлеткамі і ўзаемадзеянне з грамадзянамі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якія цікавяцца гэтай праблемай.

Праект быў створаны з нуля ў вельмі кароткія тэрміны: работа над ім пачалася ў жніўні, а ўжо ў канцы снежня інтэрнэт-рэсурс быў запушчаны для тэставання. Цяпер ён працуе ў штатным рэжыме. Пакуль часцей за ўсё пішуць у чат з удакладняючымі пытаннямі або дзеля даведачнай інфармацыі ■

■ Лад жыцця

# Лыжная эстафета, конкурсы і сустрэчы з алімпійцамі

## Як праходзіла спартыўнае свята для супрацоўнікаў МУС і іх сем'яў

**Мерапрыемства адбылося ў выхадны дзень на базе Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Дэпартамента аховы МУС у пасёлку Гарані Мінскага раёна. Акрамя супрацоўнікаў міліцыі з сем'ямі на свяце прысутнічалі хлопчыкі і дзяўчынкі з Радашковіцкай школы-інтэрната, навучэнцы Спецыялізаванага ліцэя і члены грамадскага савета пры МУС.**



Фота прэс-службы МУС.

На цырымоніі адкрыцця **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ** адзначыў, што не так часта вартавым парадку выпадае такая цудоўная магчымасць — актыўна адпачыць разам з роднымі і калегамі, з карысцю і вялікім задавальненнем правесці час. «Здаровы лад жыцця — сярод найважнейшых прыярытэтаў для Міністэрства ўнутраных спраў, таму ведамства заўсёды гатова на сваім прыкладзе паказваць суайчыннікам, наколькі важныя заняткі спортам і фізічнай культурай», — сказаў Ігар Шуневіч.

На свяце, нароўні з аматарамі, прысутнічалі і славутыя прафесійныя спартсмены: алімпійскія чэмпіёны па веславанні на байдарках і каноэ Аляксандр і Андрэй Багдановічы, а таксама Людміла Калінчык — майстар спорту міжнароднага класа па біятлоне і прызёр чэмпіянатаў свету. Яны прэзентавалі сімвалічны сувенір — мяккага белага тыгра па імені Сухаран, які быў абраны талісманам будучых Алімпійскіх гульняў у Пхёнчхане.

Галоўнай часткай сяброўскіх спаборніцтваў сталі лыжная эстафета, комплексная эстафета з сямі этапаў і перацягванне ліны. Усе ахвотныя маглі праявіць сябе ў конкурсах «Трапны стралок», «Сіламер», «Распілоўванне бярвёнаў». На свяце працавалі атракцыёны і страйкбольны цір, экспанавалася міліцэйская тэхніка, а самых маленькіх забаўлялі аніматары ў касцюмах казачных персанажаў і герояў мультфільмаў. Падсілкавацца можна было сытнай салдацкай кашай і пышнымі бліновамі, а гарачы чай выдатна дапамагаў не змерзнуць ■

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я КАСКО.

■ Векапомнае

# ЛЕТАПІС ВОГНЕННАГА ЧАСУ

## Партызанскія часопісы раскрываюць малавядомыя старонкі вайны

**Калі раней даследчыкаў цікавілі пераважна баявыя дзеянні партызанаў, то цяпер інтарэс павярнуўся ў іншы бок. Пра побытавыя малавядомыя аспекты жыцця атрадаў гісторыкі дазнаюцца з рукапісных часопісаў таго часу.**



Сёлета супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны быў выпушчаны каталог «Партызанскія рукапісныя часопісы Мінскай вобласці». Прэзентацыя выдання прайшла ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі ў Маладзечне і была прысвечана 80-годдзю з дня заснавання Мінскай вобласці. Экзэмпляры кнігі ўжо цяпер можна пагартаць у раённых музеях і бібліятэках Міншчыны.

— Трэба сказаць, што рукапісныя часопісы — унікальная гістарычная крыніца, — расказвае **дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Дзмітрый ШЛЯХЦІН,** — У музейным зборы налічваецца 248 адзінак партызанскіх рукапісных часопісаў, якія маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі «1». Музей па праве ганарыцца своеасаблівай «партызанскай энцыклапедыяй» аб жыцці, барацьбе і творчасці народных мсціўцаў. З побытавых замалёвак мы дазнаёмся пра штодзённы быт чалавека падчас вайны, тэксталагічны аналіз матэрыялаў паказвае стылі пісьма рэдактараў і аўтараў (трэба сказаць, што далёка не ўсе карэспандэнты мелі прафесійную адукацыю журналіста). Ёсць мастацкія тэксты, вершы і нават цэлыя паэмы на беларускай і рускай мовах. Нам сустракаліся інфармацыйныя тэксты — пра навіны з фронту, пра дзеянні саюзнікаў у Паўночнай Афрыцы.

Работа над каталогам пачалася ў 2008 годзе. Летась супрацоўнікі музея ўжо прэзентавалі каталог «Партызанскія рукапісныя часопісы Магілёўскай вобласці», а ў будучыні плануецца паўнавартаснае даследаванне гістарычных матэрыялаў з іншых абласцей. Ёсць шанц, што чытачы праз нейкі час змогуць дакрануцца і да факсімільнага выдання.

**Наталля ФІЛІПОВІЧ, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны** і аўтар-складальнік каталога, падзялілася найбольш цікавымі момантамі даследавання:

— На маю думку, у нас сёння сабрана найбольш поўная калекцыя рукапісных часопісаў. Мы пачыналі навуковае даследаванне калекцыі з партызанскіх часопісаў Магілёўскай вобласці (122 адзінкі), бо менавіта там з'явіўся першы часопіс за аўтарствам лясных байцоў. Што датычыцца Міншчыны, калекцыя налічвае 101 адзінку — гэта другая па колькасці выданняў вобласць. У каталогу мы рабілі акцэнт на гісторыі ўзнікнення кожнага атрада, на яго дзейнасці і на тых асаблівасцях, якія раскрываліся праз часопіс.



Па словах даследчыцы, кожнае выданне існавала ў адзінкавым экзэмпляры, гэткі эксклюзіў. Пасля таго, як гатовы нумар выходзіў у свет, яго чыталі, перадаючы з рук у рукі. Мэты і задачы рукапісных часопісаў былі адзіныя. Яны з'яўляліся адной з крыніц агітацыйна-прапагандысцкай і ідэйна-выхаваўчай работай сярод партызанаў. У гэтых самаробных «кніжачках» знаходзілася месца для вершаў, апавяданняў, гумару і нават красвордаў.

Як выглядае партызанскі часопіс? Нельга сказаць дакладна. Гэта можа быць сшытак або альбом самага рознага памеру. Матэрыялы друкавалі на машынцы ці пісалі ад рукі, а потым афармлялі малюнкамі — алоўкам, гуашшу ці нават звычайнай асадкай. Большасць малюнкаў выканалі самадзейныя партызанскія мастакі, але частка часопісаў ілюстравалася вядомымі беларускімі мастакамі Г. Бржазоўскім, М. Гурло, С. Лі, У. Сухаверхавым, Л. Бойкам. Рэдактарамі, як правіла, станавіліся сакратары партарганізацый, камандзіры, а вось склад аўтараў быў разнабаковы. Абсалютная большасць «пішучых» партызан адносілася да інтэлігенцыі, сярод іх высокай была доля настаўнікаў — каля 16 працэнтаў. З тэкстаў мы даведваемся пра тое, як людзі траплялі ў партызанскія брыгады, як яны жылі паміж баявымі аперацыямі. Тут пісалі не толькі пра подзвігі, але і пра негатыўныя бакі жыцця, высмейваліся выпадкі п'янства, марадзёрства, невыканання абавязкаў. Такія факты важныя для людзей, якія займаюцца рэканструкцыяй ваенных падзей. Даследчыкаў жа зацікавяць спісы ўзнагароджаных і поўныя спісы ўдзельнікаў брыгады ці атрада, часта нават з фотаздымкамі або партрэтамі, — такім чынам можна дазнацца пра лёс асобнага чалавека.

— Мне вельмі шкада, што доўгі час ніхто не вывучаў партызанскія часопісы. Калі б работу, якую мы пачалі адносна нядаўна, правялі ў 1950—1960-я гады, сотні людзей, якім патрабавалася дакументальнае пасведчанне сваёй партызанскай дзейнасці, або родзічы, што хацелі вызначыць лёс сваякоў-партызанаў, маглі б атрымаць гэтыя звесткі, — падзялілася Наталля Іосіфаўна.

Цікава, што для партызанаў рукапісныя часопісы былі каштоўнасцю, напэўна, нароўні з сакрэтнымі паперамі. Калі для атрада наступала небяспечная сітуацыя, іх хавалі разам са штабнымі дакументамі. «18 мая 1944 года, падчас адступлення перад перавышаючымі сіламі праціўніка і знаходжання ў бязвыхадным становішчы, наш часопіс «Большевик» разам са штабнымі дакументамі быў затоплены ў рэчцы паміж вёскамі Прыстань і Кабылічамі. Пасля чаго высушаны і зноў пушчаны ў масы», — пісаў адзін з камандзіраў партызанскага фарміравання.

— У грамадстве замацаваліся стэрэатыпы пра ваенныя падзеі, — адзначае Дзмітрый Шляхцін. — Напрыклад, хто такі ва ўяўленні некаторых людзей беларускі партызан? Барадаты дзядзька, які ў лапцях сядзіць на балоце і перыядычна выходзіць граміць нямецкія гарнізоны. Але ж насамрэч гэта далёка не так. Партызанскі рух быў добра адладжанай сістэмай, якая мела органы кіравання, цэнтральны штаб, планы дзеянняў. Канешне, за ўсім гэтым усё роўна стаяў чалавек, і пра яго мы стараемся расказваць. У музеі арганізавана вялікая экспазіцыя «Партызанскі шпіталь», сабрана калекцыя прадметаў, якімі людзі карысталіся кожны дзень. Уся гэта праца скіравана на тое, каб даць нам з вамі поўнае ўяўленне пра той складаны перыяд гісторыі. Зрабіць клопаты і радасці партызан блізкімі да разумення сучасных людзей.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

■ Тэлепраект

# У новым фармаце

## На Гродзенскай тэлестудыі вырашылі аднавіць адну з самых папулярных некалі праграм «Толькі па пятніцах»



«Только по пятницам» - легендарный бренд гродненского телевидения.

**Успомнілі пра знакамітую перадачу невыпадкова. Сёлета тэлерадыёкампанія «Гродна» адзначае 50-гадовы юбілей. І гэта добрая падстава, каб перакінуць масток з мінулага ў сучаснае, параўнаць тагачасныя праблемы і сённяшнія. Менавіта на гэтым і будзе будавацца адноўлены праект «Зноў «Толькі па пятніцах».**

Зараз ідзе актыўная работа над новай праграмай, пpаглядаюцца сотні метраў кінаі відэаплёнкі. Вядучыя **Надзея САКАЛОВА і Кацярына ШРУБЕЙКА** хвалююцца: прайшло амаль дваццаць гадоў, як выйшаў апошні выпуск папулярнай перадачы. Надзея Сакалова прызнаецца, што не адразу прыняла прапанову кіраўніцтва тэлерадыёкампаніі, але потым згадзілася. За больш чым 10 гадоў існавання праграмы назапашаны багаты архіўны матэрыял. Фрагменты могуць арганічна ўпісацца ў новы фармат. Значную ролю таксама адыграў і той факт, што многія гродзенцы і жыхары рэгіёна памятаюць праграму да гэтага часу.

— Мы выходзілі толькі ў прамым эфіры. У студыю запрашалі абавязкова чыноўніка ці іншых адказных асоб. Нагодай для гэтага служылі крытычныя сюжэты. На кожнай праграме дзяжурылі рэдактары, якія прымалі тэлефонныя званкі. І трэба сказаць, пытанні задаваліся даволі вострыя, яны агучваліся, — адзначае Надзея Сакалова.

Як успамінаюць вядучыя, новую канцэпцыю падтрымаў былы старшыня абласнога Камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні Іван Граблеўскі. Падабралася чацвёрка вядучых у складзе Кацярыны Шрубейкі, Надзеі Сакаловай, Ігара Лякіна і Віктара Блізнюка. Тэм хапала: ад вырашэння бытавых, камунальных праблем да палітычных. Былы Савецкі Саюз уступіў у перыяд перабудовы, пачаліся прыгранічныя канфлікты. Мяжа раздзяляла суседзяў адной вёскі. Жыхары беларуска-літоўскага памежжа не ўяўлялі, што яны павінны ехаць на нейкі пагранічны пункт пропуску, калі іх родныя жывуць літаральна за сотню метраў.

— Мяжа прайшла праз лёсы, — кажа Кацярына Шрубейка, — людзі не маглі схадзіць у царкву ці на магілкі, бо іх аддзяліла мяжа. Была сітуацыя, калі вясковец не мог набраць вады з калодзежа, бо той знаходзіўся за мяжой. Мы часта бывалі ў такіх вёсках, прысутнічалі на сходах, дзе жыхарам тлумачылі правілы пры перасячэнні мяжы. Зараз нагадаем гэтыя факты ў новым фармаце праграмы і раскажам, як цяпер жывуць героі былых сюжэтаў з прыгранічча.

Людзі цягнуліся да адкрытага дыялогу: на цэнтральных каналах пачалі выходзіць папулярныя праграмы «Погляд», «600 секунд» і іншыя. Для гродзенцаў такім аналагам стала перадача «Толькі па пятніцах». Яе рэйтынг быў неверагодны, адзначае **дырэктар тэлерадыёкампаніі «Гродна» Мікалай МЕЛЬЯЧЭНКА.**

Падчас вячэрняга эфіру вуліцы пусцелі, усе спяшаліся дамоў, каб не прапусціць чарговы востры дыялог на актуальныя тэмы. Упершыню кожны чалавек мог напрамую атрымаць адказ на пытанне ад любога чыноўніка. Гэта зараз у практыку ўвайшлі прамыя лініі з адказнымі асобамі, а тады сувязь была толькі праз тэлевізійны эфір. А калі хто не прыходзіў на праграму, яго места пуставала, а вядучыя агучвалі, хто і чаму не прыйшоў. Праграма праіснавала да 1999 года.

— Перад тэлебачаннем пачалі ставіцца іншыя задачы, трэба было ўзнаўляць краіну, і ўсе сілы былі накіраваны на гэта. Але праграма адыграла сваю ролю. Людзі, як кажуць, выпусцілі пару, многія дабіліся справядлівасці. А многія яшчэ доўгі час тэлефанавалі, каб журналісты праграмы «Толькі па пятніцах» прыехалі, навялі парадак.

Новы фармат абавязкова знойдзе свайго гледача, упэўнены на тэлестудыі. Гэта будзе не толькі рэтра ці нешта настальгічнае. А погляд з мінулага ў сёння.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

# 2 МІЛЬЁНЫ ТОН

## планучецца штогод выпускаць на Нежынскім абагачальным камбінаце

**Прайшло літаральна два месяцы, як карэспандэнт «Звязды» пабывала на пляцоўцы, дзе будуецца Нежынскі горна-абагачальны камбінат, непадалёку ад Любані. За гэты час тут адбыліся значныя перамены, з'явілася шмат новых канструкцый, абсталявання. Штодзень на аб'екце працуюць 300 чалавек і 150 адзінак тэхнікі. Усе работы ідуць па плане, у штатным рэжыме.**



**Галоўны спецыяліст па збудаваннях капітальных выпрацовак замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Слаўкалій» Ігар ПАРАДЗІН** паведаміў, што ў канцы студзеня плануецца запуск трох замарожвальных станцый у тэставым рэжыме. Сутнасць тэхналогіі ў тым, што на глыбіні 156 метраў будзе цыркуляваць холадагент, які панізіць тэмпературу грунту да мінус 35 градусаў і засцеражэ шахту ад пранікнення падземных водаў і затаплення, паколькі радовішча знаходзіцца ў балоцістай мясцовасці. Такі метад ужо прымяняецца на найбуйнейшых сусветных залежах карысных выкапняў

— Каля 2—3 месяцаў будзе ісці мантаж праходчага абсталявання і капра, і прыкладна да пачатку 2019 года мы выйдзем на паўнавартасную праходку механізаваным спосабам, — дадаў спецыяліст.

**Плануецца, што будаўніцтва камбіната закончыцца да 2020-га, а праз два гады ён будзе ўведзены ў дзеянне, паколькі для паўнацэннага яго функцыянавання трэба стварыць неабходную інфраструктуру. У прыватнасці, пабудаваць адміністрацыйна-бытавы комплекс, цеплаэлектрацэнтраль, газаправод, які дазволіць у перспектыве газіфікаваць больш як 20 населеных пунктаў раёна.**

Мяркуецца, што Нежынскі камбінат будзе выпускаць да 2 млн тон калійных угнаенняў штогод. Гэта яшчэ 20 % да таго, што сёння здабывае «Беларуськалій». Плануецца, што будаўніцтва камбіната закончыцца да 2020-га, а праз два гады ён будзе ўведзены ў дзеянне, паколькі для паўнацэннага яго функцыянавання трэба стварыць неабходную інфраструктуру. У прыватнасці, пабудаваць адміністрацыйна-бытавы комплекс, цеплаэлектрацэнтраль, газаправод, які дазволіць у перспектыве газіфікаваць больш як 20 населеных пунктаў раёна. Акрамя таго, ужо пачалося будаўніцтва чыгуначнай лініі ад пасёлка Урэчча да Любані.

На прадпрыемстве будзе працаваць больш як 2 тыс. чалавек. У сувязі з гэтым распрацавана праграма падрыхтоўкі кадраў горнай справы, тэхналагічнага, электратэхнічнага профілю.

— Па самых сціплых падліках насельніцтва Любані павялічыцца на 6 тыс. чалавек, — адзначыў **старшыня Любанскага райвыканкама Сяргей КАЗЕЦКІ.**

І, вядома, ужо сёння тут будуюцца жыллё, аб'екты інфраструктуры. У прыватнасці, старшыня савета дырэктараў «Слаўкалія» Міхаіл Гуцэрыеў у канцы кастрычніка мінулага года падараваў гораду новы 40-кватэры дом. У ім толькі двух- і трохпакаёвыя кватэры. Раённыя ўлады засялілі сюды людзей, якія стаялі на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Як адзначыў Міхаіл Гуцэрыеў, прадугледжана будаўніцтва яшчэ пяці такіх дамоў з адпаведнай структурай, добраўпарадкаванымі дварамі, дзіцячымі пляцоўкамі для работнікаў камбіната. Акрамя таго, на савеце дырэктараў кампаніі прынятае рашэнне дадаткова ўзвесці пяць дамоў і на бясплатнай аснове перадаць іх ва ўласнасць райцэнтра.

Запасы Нежынскага радовішча — каля 3 млрд тон калію. Расійская прамысловая група «Сафмар», у структуру якой уваходзіць «Слаўкалій», у будаўніцтва комплексу ўкладзе 600 млн долараў. Акрамя таго, кітайскі банк выдзеліў крэдыт на 1,4 млрд долараў на 14 гадоў пад 4 % гадавых.

У будаўніцтве задзейнічаны беларускія фірмы, а таксама нямецкія кампаніі Herrenknecht і Deilmann-Haniel. Унікальнасць праекта заключаецца ў адмове ад метаду выбуховых работ, які традыцыйна выкарыстоўваецца пры свідраванні ствалоў будучых шахтаў. Праходка да канчатковай глыбіні будзе выконвацца высокамеханізаваным комплексам.

Як вядома, узвядзенне Нежынскага горна-абагачальнага комплексу ў Любанскім раёне пачалося ў верасні 2015 года. На цырымоніі адкрыцця Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў перспектыве гэта дазволіць павялічыць вытворчасць калійных угнаенняў да 14 млн тон у год.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

---

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении аукциона | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | Воложинское районное потребительское общество, Минская обл., г. Воложин, ул. Партизанская, 30 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Здание торгового центра «Универмаг»** | Здание специализированное розничной торговли | 3254,7 кв. м | 632/С-27924 |

**Месторасположение предмета аукциона**: Минская обл., Воложинский р-н, г. п. Ивенец, ул. 1 Мая, 8

**Сведения о земельном участке:** пл. **0,3637** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений торгового центра «Универмаг»

**Начальная цена с НДС 20 % – 595 949,76 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок заключения договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после снятия продавцом зарегистрированных обременений по предмету аукциона в установленном законодательством Республики Беларусь порядке |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 07.03.2018** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 05.03.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by

Утерянную печать индивидуального предпринимателя Токача Иосифа Ивановича, УНН 190079602, считать недействительной

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «АГРО-САД РАССВЕТ»**

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1.** Капитальное строение (инв. №100/С-55332) – здание МТФ, общ. пл. 1147,3 м², расположенное на земельном участке пл. 0,4351 га с кадастровым номером 121284600001000004 по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Чернавчицкий с/с, восточнее д. Малая Курница | **21 520,00** | **2 152,00** |
| **ЛОТ № 2.** Капитальное строение (инв. №100/С-84999) – магазин, общ. пл. 89,1 м², расположенное на земельном участке пл. 0,0292 га с кадастровым номером 121284604601000098 по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Чернавчицкий с/с, д. Малая Курница, ул. Центральная, 43 | **5 760,00** | **576,00** |
| **ЛОТ № 3.** Капитальное строение (инв. № 100/С-55331) – здание конюшни, общ. пл. 201,1 м², расположеное на земельном участке с кадастровым номером 121284600001000003, пл. 0,0934 га по адресу: Брестская область, Брестский р-н, Чернавчицкий с/с, д. Малая Курница | **7 200,00** | **720,00** |

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Условия оплаты** | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10 BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 13 февраля 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10 – 325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам: 8 (0162) 20-92-13; 21-88-81**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 12 февраля 2018 г. до 17.00**

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Дрожжевой комбинат» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **незавершенного законсервированного капитального строения (трехэтажное здание, 37 % степень готовности)** инв. № 500/U-64218 общей площадью **749,2 кв. м,** расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000003000027 площадью **1,6424 га** по адресу: **г. Минск, ул. Октябрьская, 14/8** (далее – объект).

**Начальная цена объекта с НДС (20 %) – 366 120,00 бел. руб.**

**Задаток 10 % от начальной цены (36 612,00 бел. руб.), перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.10.2017 г. Аукцион состоится **28.02.2018 г.** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.02.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

**12 февраля 2018 года в 11.00 состоится внеочередное собрание акционеров совместного предприятия закрытого акционерного общества «Могилевский химкомбинат «Заря»**

**Повестка дня:**

1. Отчет директора СП ЗАО «МХЗ» о работе предприятия за 2017 год.
2. Принятие решения о подаче заявления совместного предприятия закрытого акционерного общества «Могилевский химкомбинат «Заря» в экономический суд Могилевской области о признании предприятия экономически несостоятельным (банкротом).
3. Определение лица, полномочного на подписание заявления СП ЗАО «Могилевский химкомбинат «Заря» в экономический суд Могилевской области о признании предприятия экономически несостоятельным (банкротом).

Начало регистрации участников собрания в 10.00. Окончание регистрации – 10.45.

Место проведения собрания: г. Могилев, пр-т Шмидта, 114 (актовый зал).

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг СП ЗАО «МХЗ» для составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном собрании акционеров, – 30 января 2018 г.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться на предприятии с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 5 февраля 2018 г.

Регистрация производится при предъявлении документа, удостоверяющего личность, для представителя акционера – паспорт и доверенность.

УНП 700210051

**Извещение о проведении 7 марта 2018 года аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Чернинском сельском Совете Брестского района**

| № лота | Местоположение земельного участка | Площадь, га | Нач. (старт.) стоимость зем. уч., руб. | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый № |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **д. Дербичи, ул. Центральная, 96**<br>**Сумма задатка, руб.**<br>**Расходы:**<br>– на изготовление градостроительного паспорта;<br>– на изготовление земельно-кадастровой документации;<br>– на регистрацию создания земельного участка;<br>– на размещение объявлений в средствах массовой информации | 0,1145 | 6 000 руб 00 коп.<br>600 руб. 00 коп.<br>334 руб. 33 коп.<br>711 руб. 98 коп.<br>87 руб. 40 коп.<br>затраты согласно акту выполненных работ | Строительство и обслуживание одноквартирного (блокированного) жилого дома; № 121285000601000198 |

К земельному участку в д. Бердичи, ул. Центральная, 96 имеется подъездная грунтовая дорога, рядом проходит линия электропередачи, газопровод. Участок свободен от застройки.

Аукцион будет проводиться 7 марта 2018 года в 10.00 по адресу: Брестский район, а. г. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание Чернинского сельисполкома). Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернинского сельисполкома № BY95AKBB36410000003051000000, филиал 100 ОУ «АСБ Беларусбанк», г. Брест БИК AKBBBY21100, назначение платежа 04901, залога в размере 10 % от начальной цены земельного участка; документ, подтверждающий личность покупателя (паспорт).

Заявления для участия в аукционе принимаются по адресу: а. г. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание Чернинского сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений до 17.00 1 марта 2018 года.

Контактные телефоны: 94 31 35. 94 31 36, 94 31 67.

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе по продаже здания хранилища, г. Минск, пр-д Масюковщина, д. 2, корп. 2**

Лот № 1. Здание хранилища (литер А 1/К) с инв. № 500/С-38265. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, г. п. – 1979; этажность – 1; общая площадь – 1601,6 кв. м.

**Начальная цена продажи – 555 300,00 бел. руб.**
**Задаток – 55 530,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 500000000006001528, расположенный по адресу: г. Минск, пр-д Масюковщина, д. 2, корп. 2, пл. 1,5886 га. Назначение – эксплуатация и обслуживание здания хранилища. Право аренды по 30.11.2017. Поданы документы на продление права аренды. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Здание частично (961,6 кв. м) находится в аренде

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 06.03.2018 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (здание хранилища) (Лот № 1), проводимом 06.03.2018 (Фрунзенский МРО).

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 04.03.2018 г. в 11.00.

Все желающие могут ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Бирюков Юрий Алексеевич, тел. +375-29-115-55-77

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

# ПРАЎДА І ХЛУСНЯ ПРА СМАЖАНУЮ ЕЖУ



**Смажаная ежа не такая небяспечная? Што новага даведаліся вучоныя пра згубны ўплыў смажанай ежы на наша здароўе? Правакуе яна інфаркт ці не?**

Шмат разоў вучоныя сцвярджалі са старонак і сур'ёзных навуковых, і лёгкіх глянцавых часопісаў: смажанае шкодна для сэрца. І толькі нядаўна высветлілася, што гэта крыўдная памылка. Новыя маштабныя даследаванні адназначна даказалі: нашаму сэрцу няма ніякай розніцы, падсілкаваліся мы гарачай смажанай адбіўной ці адварнымі фрыкадэлькамі.

**Вось самыя распаўсюджаныя міфы пра смажаную ежу.**

***1. Ці праўда, што смажаная ежа набліжае сардэчны прыступ?***

Не. Дактары з ЗША 21 год назіралі за тысячай пацыентаў, якія харчаваліся па-рознаму. За гэты час сардэчны прыступ здарыўся ў кожнага чацвёртага. Але роўна палова з іх цалкам пазбягала смажанага. Так што ў адкладанні артэрыяльных халестэрынавых бляшак, якія і вядуць да інфаркту, вінаватая не смажаная ежа, а занадта тлустая і салодкая.

***2. Смажаная ежа заўсёды атрымліваецца тлустай.***

Тлустымі мяса ці бульба атрымліваюцца не таму, што іх смажаць, а таму, што выкарыстоўваюць пры гэтым сланечнікавы алей. І як правіла, 9 з 10 чалавек наліваюць яго ў чатыры разы больш, чым трэба. А можна смажыць на патэльні-грыль ці керамічнай. І такая ежа, прыгатаваная без алею, будзе значна менш тлустай. І гэта дапамажа пахудзець.

***3. У смажанай ежы шмат халестэрыну, а ён шкодны для сэрца.***

Так, халестэрын шкодны. Толькі трэба запомніць, што ён ёсць толькі ў прадуктах жывёльнага паходжання. Гэта значыць, калі вы смажыце бульбу на сланечнікавым алеі, то халестэрыну там няма ні кроплі. А смажыць штодзень на сметанковым масле ці свіным сале сапраўды не вельмі карысна. Але пакольі сметанковае масла дарагое і яго не назапасішся, а сала ўсяму надае свой смак, то на патэльню іх амаль ніхто і не пускае.

***4. Значыць, есці смажанае можна колькі заўгодна?***

Не. Пару разоў на тыдзень — тое, што трэба. Інакш наліпнуць лішнія кілаграмы, якія і будуць нагружаць сэрца. Да таго ж, спраўляцца са смажанай ежай арганізму складаней за ўсё. Хоць шкоды ад такой ежы не так і шмат, як прынята думаць, але і карысці менш, чым ад варанага ці паранага.

# Клапаціцца пра прыгожую постаць варта з дзяцінства

**З болямі ў спіне рана ці позна сутыкаецца ледзь не кожны з нас. З-за чаго яны ўзнікаюць і як іх папярэдзіць, як захаваць пазваночнік у норме, калі ў вас сядзячая работа, і аб чым павінны памятаць дачнікі, расказала загадчык 1-га тэрапеўтычнага аддзялення 31-й гарадской паліклінікі г. Мінска Кацярына ГУБІЧ.**

***— З чым могуць быць звязаны болі ў спіне?***

— З такімі болямі найперш трэба звяртацца да ўчастковага тэрапеўта і шукаць іх прычыну. Самая распаўсюджаная — астэахандроз пазваночніка, міжпазваночная грыжа — як правіла, яны і выклікаюць болі. А ў цэлым прычын шмат, гэта і захворванні органаў брушной поласці, у прыватнасці, кішэчніка, у жанчын — органаў малога таза. Трэба праверыць ныркі і жоўцевы пузыр — камяні ў іх таксама могуць выклікаць боль у пояснiцы. Такім чынам, хвораму прызначаюць адпаведныя аналізы і даследаванні і выяўляюць прычыну.

> **«Калі вы 10 гадоў нічым не займаліся, то пачынаць са штангі, зразумела, не трэба. Увогуле пазваночнік не любіць рэзкіх рухаў і рыўкоў».**

***— Чаму ўзнікае астэахандроз?***

— Ён звязаны з нашым вертыкальным становішчам, і з узростам, на жаль, узнікае ва ўсіх. Зношваюцца міжпазваночныя дыскі — у кагосьці больш марудна, у некага хутчэй. Калі таўшчыня міжпазваночнага дыска нераўнамерная, зацiскаюцца нервовыя карэньчыкі, з'яўляецца болевы сіндром. У тых, хто мае спадчынную схільнасць, хвароба развіваецца з маладога ўзросту. Калі праца звязана з падняццем цяжару, таксама пазваночнік будзе хутчэй зношвацца. Акрамя гэтага, уплывае лішняя вага, сядзячы лад жыцця, траўмы. У асоб без фактараў рызыкі праблемы звычайна з'яўляюцца пасля 40 гадоў. Таму з гэтага ўзросту трэба пачынаць прафілактыку астэахандрозу. Асноўная рэкамендацыя — весці здаровы лад жыцця. Найперш гэта адэкватная фізічная нагрузка, скіраваная на ўмацаванне мышачнага гарсэту, прычым і мужчынам, і жанчынам займацца ёй трэба пастаянна. Пры гэтым пазбягаць рэзкага пад'ёму цяжараў. Найлепш для спіны падыходзіць плаванне, гэта ўніверсальны від спорту, у якога мала супрацьпаказанняў. Або іншыя нагрузкі — трэнажорная зала ці фітнес. Праўда, калі вы 10 гадоў нічым не займаліся, то пачынаць са штангі, зразумела, не трэба. Увогуле пазваночнік не любіць рэзкіх рухаў і рыўкоў.



***— Радыкуліт — гэта хвароба дачнікаў?***

— Не зусім так. Пры радыкуліце заціскаюцца нервовыя карэньчыкі спіннога мозгу, што і выклікае боль. У дачнікаў ён проста абвастраецца. Радыкуліт узнікае пазней, чым астэахандроз, прыкладна, пасля 50 гадоў. Аднолькава часта і ў мужчын, і ў жанчын. Прафілактыка тая ж — фізічныя нагрузкі, напрыклад, лячэбная фізкультура, якой можна займацца нават у групах пры паліклініках, а таксама нашэнне падтрымліваючых гарсэтаў, артэзаў, паясоў. Важна пазбягаць пад'ёму цяжараў. Акрамя гэтага, прызначаюцца курсавыя прыёмы хондапратэктараў. Яны карысныя ў такім узросце і для пазваночніка, і для суставаў.

***— Як правільна паводзіць сябе тым, хто ў сезон выязджае на дачу?***

— Як правіла, зімой многія людзі ва ўзросце не займаюцца рэгулярна фізічнымі нагрузкамі, а вясной рэзка пачынаюць капаць, насіць вёдры з вадой для паліву. Тут важна правільна размяркоўваць нагрузку на працягу дня. Калі ёсць удакладнены дыягназ, карыстацца гарсэтамі, паясамі на пояснiчны аддзел пазваночніка. І не забываць пра курс хондапратэктараў.

***— Якая мінімальная фізічная нагрузка патрэбна чалавеку?***

— Нам неабходна інтэнсіўная аэробная нагрузка па 30 хвілін пяць дзён на тыдзень. Гэта абсалютна для ўсіх.

***— Хадзьба на работу лічыцца фізічнай нагрузкай?***

— Калі гэта хадзьба, то яна павінна быць інтэнсіўная, а не прагулачная. Бег, плаванне, фітнес — любая нагрузка падыходзіць. Калі ў вас сядзячая работа за камп'ютарам, то кожную гадзіну рабіце перапынак — паруханйцеся 10 хвілін.

***— Ці важна трымаць спіну ў цяпле?***

— У людзей з фактарамі рызыкі ці ў тых, у каго ёсць удакладнены астэахандроз, радыкулапатыя, грыжа дыска, пажадана ў зімовы перыяд беражліва да сябе адносіцца — насіць не кароткае, а доўгае верхняе адзенне, падоўжаныя курткі, пасля душу не выходзіць на вуліцу — гэта апраўдана.

***— Бывае такое, што летам болі ў спіне не турбуюць, а вось зімой з'яўляюцца?***

— Хутчэй не зімой, а вясной і восенню здараюцца абвастрэнні. Гэта звязана з дачным сезонам, калі саджаецца і ўбіраецца ўраджай. Таму, як я казала, трэніруйце мышачны гарсэт круглы год. У многіх паліклініках пры аддзяленнях рэабілітацыі створаны праграмы для ўмацавання мышцаў спіны, карэкцыі постаці, зніжэння вагі. Пад кіраўніцтвам кваліфікаваных спецыялістаў па лячэбнай фізкультуры праводзяцца спецыяльныя заняткі. Таксама прызначаюцца курсы масажу, рэабілітацыя пры радыкулапатыі і болевым сіндроме.

***— Наколькі неабходныя людзям з астэахандрозам курсы масажу, іншыя фізіяпрацэдуры?***

— Пажадана іх праходзіць рэгулярна. Курсы масажу патрэбны і здароваму чалавеку для прафілактыкі. Паказаныя яны і пры скрыўленні постаці — так убіраецца напружанне мышцаў.

***— Калі з'явілася міжпазваночная грыжа, як з ёй змагацца?***

— Грыжа, на жаль, застанецца назаўсёды. Важна назіраць за яе памерамі, сачыць, каб яна не расла. Для гэтага таксама неабходна ўмацоўваць мышачны гарсэт, каб пазванкі не перамяшчаліся і не давілі на грыжу. Калі яна не расце, боляў не будзе.

***— Наколькі важна з праблемамі ў спіне трымаць вагу ў норме?***

— Важна, бо лішняя вага пагаршае стан. Трэба трымаць дыету, багатую на вітаміны і мінералы для нармалізацыі абмену касцявой тканкі.

***— Правільнай постацю трэба займацца...***

— ... з дзяцінства. Правільная постаць пачынаецца са школьнай парты. Важна займацца танцамі, гімнастыкай, плаваннем — гэта найбольш падыходзячыя віды спорту, якія фарміруюць правільную постаць на ўсё астатняе жыццё.

# «БЯСШКОДНЫЯ» ЗВЫЧКІ,
## ад якіх пакутуе сэрца



**ГУТАРКА пойдзе не пра алкаголь—цыгарэты—стрэсы, якія, зразумела, нашаму сэрцу не памочнікі. Сярод штодзённых звычак, на якія мы нават не звяртаем увагу, нямала тых, якія падточваюць здароўе міякарда. Што шкодзіць нашаму сэрцу, расказала ўрач аддзялення дзённага знаходжання 2-й цэнтральнай паліклінікі г. Мінска Алена ЛАПСАР.**

**1. Доўга сядзець перад тэлевізарам.**

— Некалькі гадзін перад тэлевізарам істотна павышаюць рызыку інфаркту, гэтак жа як і інсульту, — адзначае Алена Сяргееўна. — Сядзячы лад жыцця і недахоп руху негатыўна адбіваюцца і на абменных працэсах, і на ўзроўні цукру ў крыві. Акрамя гэтага, ад доўгага сядзення ў адным становішчы парушаецца адток крыві ў канечнасцях, што можа прыводзіць да яе згушчэння і ўтварэння тромбаў.

**2. Не звяртаць увагу на храп.** Многія не лічаць гулкія рулады нейкім асаблівым недахопам. На самай справе вельмі часта храп — сімптом дрэннага сардэчнага стану. І небяспечны ён тым, што правакуе павышэнне ціску і парушэнне сардэчнай дзейнасці.

**3. Нерэгулярна чысціць зубы.** Здавалася б, якая сувязь паміж зубамі і сэрцам? Аднак яна ёсць. Вучоныя высветлілі, што «банальная» старанная чыстка зубоў двойчы ў дзень і нагляд у стаматолага могуць рэальна падоўжыць жыццё на 10 і больш гадоў.

— У ротавай поласці знаходзіцца вельмі шмат бактэрый, больш за 350 відаў, — кажа Алена Лапсар. — Не асабліва дбайны догляд зубоў вядзе да кровачачывасці дзяснаў. І мікробы праз пашкоджаныя капіляры могуць трапіць у кровацок і нават стаць прычынай утварэння тромбаў.

Дарэчы, ужо даказана, што бактэрыі роду gingivalis уздзейнічаюць на фактары згушчальнасці крыві. А тромб, які адарваўся, можа закупорыць крывяносны сасуд і нават прывесці да інфаркту міякарду ці лёгачнай эмбаліі. Вучоныя лічаць, што недастатковая ўвага да штодзённай гігіены зубоў на 70 % павялічвае рызыку сардэчна-сасудзістых хвароб.

**4. Занадта актыўна займацца спортам.** Хадзьба і плаванне — аптымальныя нагрузкі для сэрца. А вось празмерная стараннасць у спартзале, наадварот, аслабляе сэрца. Асабліва небяспечна рэзка змяняць тэмп нагрузак. Многія людзі, часта ва ўзросце паміж 40 і 50 гадамі, раптоўна прымаюць рашэнне радыкальна змяніць фігуру. Запісваюцца ў трэнажорную залу і пачынаюць актыўна займацца. Аднак такія рэзкія перамены для арганізма ў цэлым, і для сардэчна-сасудзістай сістэмы ў прыватнасці, — моцны стрэс.

**5. Пераядаць.** Нават калі ў вас ад прыроды стройная фігура і атлусценне вам не пагражае, пераяданне вельмі небяспечнае для сэрца. Вялікі аб'ём ежы павялічвае нагрузку на крывяносныя сасуды брушной поласці. А гэта прымушае сэрца працаваць з падвоенай нагрузкай.

**6. Часта ўжываць чырвонае мяса.** Яно ўтрымлівае шмат насычаных тлушчаў.

— Згодна з некаторымі даследаваннямі, гэта павышае рызыку ўзнікнення хвароб сэрца і атэрасклерозу сасудаў. Чырвонае мяса павінна складаць не больш за 10 % ад агульнай долі прадуктаў жывёльнага паходжання ў вашым рацыёне, — нагадвае ўрач.

**7. Рэдка есці садавіну і агародніну.** Даказана, што штодзённае ўжыванне 300 грамаў свежай садавіны і агародніны зніжае рызыку ўзнікнення хвароб сэрца на 20 %. Справа ў тым, што акрамя важных для сэрца вітамінаў C і K, садавіна і агародніна багатая на клятчатку і пекціны, якія «чысцяць» сасуды.

Матэрыялы падрыхтавала
**Алена КРАВЕЦ.**

# ЖАЛЕЗА ВУЧЫЦЬ ЦЯРПЛІВАСЦІ І ФАНТАЗІІ

## Докшыцкі самавук пра работу, сям'ю і домік з садам

**Кожны, хто трапіць у Докшыцы, абавязкова заўважыць работы Уладзіміра ШУТКІНА — скульптуры з жалеза, каваныя лаўкі, узорыстыя металічныя вароты. Калі ж пашанцуе, як карэспандэнту «Звязды», патрапіць у майстэрню мясцовага каваля, то вочы літаральна разбягаюцца: гатовыя вырабы суседнічаюць з нарыхтоўкамі, і разабрацца, дзе ёсць што, можа толькі сам гаспадар.**


Сямейны ачаг Уладзіміра і Таццяны.

### Плугі, металічныя ружы і невядомыя рагуліны

Як індывідуальны прадпрымальнік Уладзімір Валянцінавіч зарэгістраваўся 15 гадоў таму, але з металам пачаў працаваць намнога раней.

— На хлебазаводзе быў зваршчыкам. Дапамагаў суседзям — варыў каму духоўку, каму веласіпед, каму плуг... Спачатку нават не думаў, што работы паболее. А потым з'явілася мода на розныя прыгожыя рэчы з жалеза — фігуркі на стрэхах, каваныя агароджы. Прыехаў да мяне аднойчы знаёмы і кажа: «У мяне сябар пчаляр, яму на вароты трэба металічная пчала». Змайстраваў пчалу — з'явіліся іншыя заказы. Справа так разгарнулася, што перастаў адзін спраўляцца. Тут сын якраз скончыў вучыцца на механізатара, а я яму прапанаваў паспрабаваць кавальскую работу. Далей — болей. Выйшла замуж старэйшая дачка. Зяць да нас у майстэрню спачатку проста хадзіў, а потым рашыўся: «Давай паспрабую». Я не забараняў — калі ўпадабае, то нікому горш не будзе. Шэсць гадоў прайшло, малодшая дачка таксама прывяла ў сям'ю мужа. Той раней працаваў вальшчыкам у лясніцтве, напачатку сумняваўся, ці атрымаецца, а як аказалася, ці не больш за другіх ад мяне пераняў.

У руках каваля нават металічны лом ператвараецца ў эксклюзіўныя прадметы. Напрыклад, не адразу заўважаеш, што спінка для крэсла раней была часткай старога, яшчэ «савецкага» ложка. Металічная ружа выглядае крохкай і далікатнай, пакуль не возьмеш яе ў рукі. Паходзіш сярод гэтай прыгажосці і мімаволі параўнаеш яе з экспазіцыяй у музеі.

— Музей зараз пакажу, — усміхаецца гаспадар.

І сапраўды, кажуць людзі: у каго падкова над варотамі, таму шчасце будзе. Уладзімір Шуткін такіх шчаслівых талісманаў назбіраў на цэлую сцяну. А разам з імі — дзясяткі клямак, стрэмёнаў, рагачоў, замкоў і многа іншага, чаму недасведчаны чалавек нават назвы не знойдзе.

— Гэта работы кавалёў Докшыцкага раёна, некаторыя з іх працавалі яшчэ да рэвалюцыі. Паглядзіце, звычайная клямка, а як яна расказвае пра свайго стваральніка! Унікальны майстар нават з простай рэчы мог зрабіць твор мастацтва — з завітушкамі і ўзорамі.

Я раней нават не ўяўляў, як многа працы было ў каваля, — прызнаецца майстар. — Вось, напрыклад, рэдка хто можа вызначыць, для чаго патрэбна такая рагуліна. А гэта як у вёску праводзілі электрычнасць, каваль наразаў самаробныя гайкі, збіраў і скручваў аснову і на яе замацоўваліся ізалятары. Сёння такую штуку можна зрабіць за некалькі хвілін, а ў мінулыя часы каваль праваждаўся б гадзінамі. Мяне наогул захапляе, як у даўніну рабілі складаныя механізмы толькі на балтах і скобах.


Казачны свет докшыцкага майстра.

### Мастацкая чаканка і лёсавызначальная рука бетоннага салдата

У майстэрні докшыцкага ўмельца на сценах нібы вокны ў казачны свет. Там скачуць алені, укленчваюць перад царэўнамі віцязі, стары лірнік расказвае казкі ўважліваму слухачу.

— Жалеза, яно цікавае. Вучыць цярплівасці і фантазіі, бо трэба загадзя ўяўляць прадмет, які хочаш зрабіць. Мне было 14 гадоў, калі маці параіла схадзіць да мастака-афарміцеля, які займаўся мастацкай чаканкай — умеў рабіць прыгожыя «малюнкі» на метале. Памятаю першае сваё заданне — малюнак, на якім мядзведзь нясе кораб з Алёнкай. Я яго вычаканіў, настаўнік на работу паглядзеў, пахваліў: «Ну, крыху кеміш». І сказаў зрабіць той жа малюнак, толькі крыху інакш. І так разоў пяць, пакуль не прызнаў, што са мною займацца будзе плён. Так я зразумеў, што нават калі перад вачамі малюнак на паперы, поўнасцю яго не скапіруеш. Заўсёды можна прыдумаць іншы фон, паставіць фігуры ў больш эфектны разварот. Вялікі дзякуй першаму настаўніку за гэту навуку.

Пасля ўзорыстых падсвечнікаў і чаканых карцін неяк не чакаеш, што пасярод памяшкання ўбачыш загадкавы агрэгат. Больш за ўсё ён нагадвае рухавік машыны. Аказалася, гэта сапраўдная «кулібінская распрацоўка» — металічная печка, сканструяваная па адмысловай замове. Здавалася б, пры чым тут печка, калі гаспадар займаецца кавальствам? Аднак не ўсё так адназначна...

— Насамрэч у рабоце печніка і чаканшчыка многа агульнага, — тлумачыць Уладзімір. — Калі ты робіш печку, то загадзя прадумваеш, які будзе канчатковы вынік, куды выведзеш канал, каб у хаце было цёпла і не дымна. Тое самае ў чаканцы: малюнак толькі намеціш, а ўжо ведаеш, як яго закончыш.

Печкі майстар складвае з 1985 года. Як кажуць, жыццё прымусіла навучыцца.

— Калі ажаніўся, то вырашылі з жонкай купіць асобны дом у Докшыцах. А там аказалася дрэнная печка. Трэба перакладваць, я не ўмею, майстроў па раёне можна на пальцах рукі пералічыць. Цешча параіла чалавека, які, па чутках, разумеў у гэтай справе. Ён пліту склаў, а за абедам хапіў лішку гарэлкі і «выключыўся». Адвёз я работнічка дамоў і вырашыў, што прасцей самому дарабіць, бо пакуль пячнік працаваў, сёе-тое расказваў. А далей цікава выйшла. На той час я будаваў дамы па дамове. Аднойчы прараб намякнуў, што нядрэнна было б яшчэ і печку злажыць. І тут нібы лёс умяшаўся — напярэдадні 9 мая ў фігуры салдата адвалілася рука. Пакуль умацоўваў скульптуру арматурай, пасябраваў з ветэранам вайны, які гэты помнік даглядаў. Ён у мірны час разумеў кавальскую справу і печніком быў. Многа карыснага падказаў, пакуль я не «ўрубіўся» што да чаго.

Цяпер Уладзімір пячной справай не займаецца. Можа толькі парадамі дапамагчы. Работа печніка на вёсках запатрабаваная і сёння, вось толькі рукі-ногі ад яе баляць.

— Не навука — цэглу пакласці. Каб печка атрымалася, трэба ў кожнай цагліны выбраць правільны бок — паглядзець, дзе сажа засталася, дзе вугалок адбіты... — успамінае майстар. — У мяне недзе быў сшытак з занатоўкамі пра тыпы печак. Дамы розныя, і печкі трэба будаваць пад кожны дом. Потым прыходзіў, цікавіўся ў гаспадароў, ці добра атрымалася, і тады альбо перарабляў, альбо ўдалыя варыянты запамінаў.


У кавальскай майстэрні Уладзімір ШУТКІН *(у цэнтры)*, яго сын Дзмітрый *(злева)* і зяць Іван САКАЛОЎСКІ *(справа)*.

### «Табліца Мендзялеева» пад адным дахам

У доме Шуткіных цёпла і светла. Таццяна Васілеўна частуе гасцей чаем са скрыпеню.

— Чалавек у мяне гаварлівы, ён і ў маладосці такі быў. Усяго было ў жыцці, муж захапляўся рознымі справамі, але без рызыкі не пражыць. Мне маці казала: «Бачыш, што чалавек добры, разумее ў справе, то не спрачайся з ім», — гаспадыня сапраўды выглядае ціхай і спакойнай. Пакуль муж прападае на рабоце ў майстэрні, жанчына даглядае дом, дзяцей, клапоціцца пра ўтульнасць.

— З Таняй пазнаёміліся ў цэнтры горада, — успамінае Уладзімір. — Я жыў тады ў інтэрнаце, а яна працавала ў магазіне. Зайшоў неяк туды па дробязі і адразу прыкмеціў дзяўчыну. Так яна спадабалася, што пачаў наведвацца часцей, песні спяваў пад гармонік. Год сябравалі, а потым пажаніліся.

У мінулым годзе сужэнцы Шуткіны адсвяткавалі 35 гадоў, якія пражылі разам. Летам разам з дочкамі Людмілай і Вольгай, сынам Дзмітрыем і шасцю ўнучкамі выязджаюць на дачу — да рэчкі, возера... Мару пра домік з садам гаспадар прывёз з Казахстана, дзе жыў раней.

— Нарадзіўся ў Іжэўску. У Казахстан трапіў зусім малым — бацькі выехалі на цаліну, аднак у цягніку пазнаёміліся з іншымі вандроўнікамі і аселі ў горадзе Балхаш. Уявіце вялізнае возера і горад на беразе, а да суседняй Караганды ехаць 400 кіламетраў.

Наш дом быў шматкватэрны, побач жылі чачэнцы, карэйцы, немцы, татары, башкіры, эстонцы, беларусы... Як гэта кажуць, сабралася ўся «табліца Мендзялеева» пад адным дахам. У кожнага народа свае традыцыі, стравы, гульні. Дзецьмі мы адзін да аднаго ў госці бегалі і нават не задумваліся, што нехта іншай нацыянальнасці. Мы з жонкай, бывае, прыязджаем туды да сяброў у госці.

Давялося за жыццё многа дзе пабываць: службу праходзіў у Германіі, па накіраванні ад камсамола ездзіў будаваць метро ў Польшчу. У Беларусь трапіў пасля арміі і адразу ўпадабаў гэтыя мясціны. Асабліва прыгожа вясной, калі сад цвіце — такога ў Казахстане не бачыў раней. Знайшоў тут дом, сям'ю, справу — вось так і прыжыўся.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
**Фота аўтара**


Кавальскія вырабы Уладзімір знаходзіў сам або атрымліваў ад знаёмых. Так з'явіўся «музей на сцяне».

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»15 марта 2018 года проводит 4-й открытый аукцион
## по продаже имущества республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 35 | Грузовой Урал-43202 ш.035789 дв. 727950 1985 г. 4 кат. 66 238 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 000,00 | 700,00 |
| 36 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 133074 дв. 505523 1989 г. 3 кат. 86 973 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 000,00 | 700,00 |
| 37 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 152523 дв. 639438 1990 г. 4 кат. 68 963 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 500,00 | 750,00 |
| 38 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. XTP4320220-01L0145902 дв. 394211 1990 г. 4 кат. 66 578 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 500,00 | 750,00 |
| 39 | Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном К2-375 в составе: кузов-фургон К2-375 № 09059 1987 г. 2 кат. Автошасси Урал-375АМ ш. 457582 дв. 899670 1987 г. 3 кат. 369 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 7 500,00 | 750,00 |
| 40 | Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К-375 в составе: кузов-фургон К-375 № 01236 1977 г. *2 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 256884 дв. 6335 1977 г. *3 кат. 1 256 км* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 7 500,00 | 750,00 |
| 41 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном АВС-2М/3 в составе: кузов-фургон АВС-2М/3 № 0100470871 1971 г. *2 кат.* Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 4523222 дв. 404823 1971 г. *3 кат. 1 397 км* | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 4 300,00 | 430,00 |
| 42 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе: кузов-фургон К-66 № 204377 1977 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0096771 дв. 1443811 1977 г. *3 кат. 1 782 км* | г. Барановичи, в/ч 97047 | 3 000,00 | 300,00 |
| 43 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе: кузов-фургон К-66 № 146376 1976 г. 4 кат. Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0044157 дв.1180201 1976 г. 3 кат. 1 153 км | г. Барановичи, в/ч 97047 | 3 000,00 | 300,00 |
| 44 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе: кузов-фургон К-66 № 92372 1972 г. 4 кат. Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 4666903 дв. 532986 1972 г. 3 кат. 1 313 км | г. Барановичи, в/ч 97047 | 3 000,00 | 300,00 |
| 45 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе: кузов-фургон К-66 № 107372 1972 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 4683530 дв. 549063 1972 г. *3 кат. 1 252 км* | г. Барановичи, в/ч 97047 | 3 000,00 | 300,00 |
| 46 | Специальный автомобиль КамАЗ-43101 с кузовом-фургоном К1.4320Д в составе: кузов-фургон К1.4320Д № 02500 1989 г. *4 кат.* Автошасси КамАЗ-43101 ш. 0019523 дв. 559868 1990 г. *4 кат. 16 230 км* | г. Минск, в/ч 68473 | 8 000,00 | 800,00 |
| 47 | Специальный автомобиль КамАЗ-43101 с кузовом-фургоном К1.4320Д в составе: кузов-фургон К1.4320Д № 11505 1989 г. 4 кат. Автошасси КамАЗ-43101 ш. 0019183 дв. 0691860 1990 г. 4 кат. 10 035 км | г. Минск, в/ч 68473 | 8 000,00 | 800,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **15 марта 2018 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **16.00 12 марта 2018 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **15 марта 2018 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY31BLBB30120101099370001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29, код BLBBBY2X, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 (RUR), в Центре банковских услуг № 701, ОАО»БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код BPSBBY2X, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел./факс: (017) 398 05 41**

## Узденский районный исполнительный комитет 14 марта 2018 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 418 (4-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам и в 11.00 аукцион на право заключения договора аренды земельных участков

На аукционные торги выставляется участок:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Нач. цена (бел. руб.) | Расх. по подгот-ке (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Узденский райисполком | СТ «Здоровье XX век», № 45 | 0,0540 | 625680200018000002 | 700,00 | 1 267,06 | . |

На повторные аукционные торги в частную собственность выставляется:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Нач. цена (бел. руб.) | Расх. по подгот-ке (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | Узденский райисполком | г. Узда, ул. П. Глебки, уч. № 5 | 0,1335 | 625650100003001658 | 12 500,00 | 1 151,90 | Охранная зона: рек и водоемов; электрических сетей; объектов газораспределительной системы |

Целевое назначение лота № 1 – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Имеется возможность подключения к газоснабжению, электроснабжению, к водоснабжению на расстоянии 80–100 м.

Целевое назначение лота № 2 – для коллективного садоводства.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY18AKBB36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, БИК банка AKBBBY2X, код платежа – 04901 платежным поручением (квитанцией) с пометкой «Задаток за земельный участок».

На право заключения договора аренды выставляется:

| № лота | Арендодатель | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Нач. цена (бел. руб.) | Расх. по подгот-ке (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Узденский райисполком | г. Узда, ул. К. Маркса, объект № 17 | 0,3953 | 625650100003001671 | 34 757,23 | 1 493,89 | Охранная зона: линий связи и радиофикации, газораспределительной системы |

На повторные торги на право заключения договора аренды выставляются участки:

| № лота | Арендодатель | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Нач. цена (бел. руб.) | Расх. по подгот-ке (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | Узденский райисполком | г.Узда, ул. Белевича, объект № 38 | 0,0660 | 625650100003001661 | 20 175,89 | 1 420,01 | Охранная зона: линий связи и радиофикации, сетей и сооружений водоснабжения, канализации |
| 3 | Узденский райисполком | г. Узда, ул. Широкая, уч. № 1 | 0,1378 | 625650100002000283 | 7 395,65 | 1 418,40 | Охранная зона: электрических сетей, сетей и сооружений водоснабжения, объектов газораспределительной системы |

Целевое назначение лота № 1 – для строительства объектов общественного питания; лота № 2 – для установки и обслуживания торгового павильона; лота № 3 – для строительства и обслуживания здания магазина.

Инженерно-техническое обеспечение участков имеется.

Срок аренды участков – 50 лет.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предъявить:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

копии документов, подтверждающих внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копию документа заявителя, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта) покупателя или его доверенного лица;

представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, а также копии документов о государственной регистрации ИП, юридического лица, копии учредительных документов, представителем или уполномоченным должностным лицом – нотариально удостоверенная доверенность (для уточнения правильности оформления необходимого пакета документов обращаться по телефону 8 (01718) 53738).

После получения необходимых документов от гражданина, индивидуального предпринимателя и юридического лица на участие в аукционе комиссия или организация выдает ему билет участника аукциона, который перед началом аукциона необходимо обменять на аукционный номер.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, по рабочим дням с 1 февраля по 9 марта 2018 года включительно с 8.00 до 17.00.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии двух и более участников аукциона.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY18AKBB36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код банка AKBBBY2X, код платежа на право заключения договора аренды земельного участка – 04002 платежным поручением (квитанцией) с пометкой «Задаток за земельный участок».

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заключительная регистрация – с 8.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков, предварительно позвонив по телефонам: 8 (01718) 65404, 54705.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by либо по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, каб. 206 и по телефону (801718) 53738.

Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН (серия БА) № 0999814 считать недействительным

## Извещение о реализации недвижимого имущества ОАО «Барановичидрев», имеющего высокий износ
## Четвертые повторные торги состоятся 9 февраля 2018 года, в 14.00, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.

**Цена всех Лотов №№ 8–13 установлена ликвидационной комиссией и снижена на 60 % от первоначальной цены.**

Сумма задатка: 10 % от начальной цены Лотов в рублях РБ.

Получатель платежа: 225410, ОАО «Барановичидрев», г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, р/с: BY68BPSB30121226161389330000; БИК BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск; УНН 200299909.

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по ЛОТАМ в срок до 14.00 05.02.2018 года организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу:

**225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».**

Конт. тел.: 8 029 6332490 Vel; (029) 824-80-26 МТС; факс (0163) 45-51-24.

E-mail: **mischuk_am@mail.ru.**

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов в срок не позднее 05.02.2018, проинформировав участников торгов, подавших заявление об участии в торгах, об отказе в их проведении.

Возмещение победителем торгов расходов по оценке, регистрации капитальных строений и земельных участков, а также по заключению и регистрации сделки купли-продажи и других расходов по проведению аукциона.

**Дополнительным условием** к Лотам № №-8–13 является обязательное заключение отдельного договора купли-продажи имеющегося на приобретаемой территории асфальтного покрытия, ограждения (забора), ворота, зеленых насаждений, коммуникаций и прочего имущества по данным бухгалтерского учета

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

В случае признания аукциона несостоявшимся по какому-то из выставляемых Лотов в связи с подачей заявления на участие в нем только одним участником, предмет торгов может быть продан этому участнику при его согласии по цене торгов, увеличенной на 5 (%) процентов.

### ПРЕДМЕТЫ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

### ЛОТ № 8 – 40 000,00 рублей, без НДС

1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-113733, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/25, общей площадью 98,9 кв. м, целевое назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание велосипедной, что подтверждается свидетельством о государственной регистрации от 7 июля 2017 года за номером 110/530-18802, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Указанное капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003571, зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/25, общей площадью 0,0278 га, в соответствии со свидетельством о государственной регистрации от 2 октября 2017 года за номером 110/530-19338, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

### ЛОТ № 9 – 120 000,00 рублей, без НДС

1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-113734, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/24, общей площадью 54,8 кв. м, целевое назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание проходной, что подтверждается свидетельством о государственной регистрации от 7 июля 2017 года за номером 110/530-18803, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Цена объекта: 40 000,00 рублей, без НДС.

Указанное капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003568, зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/24, общей площадью 0,0249 га, в соответствии со свидетельством о государственной регистрации от 21 сентября 2017 года за номером 110/530-19255, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

2) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112746, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/7, общей площадью 96,9 кв. м, целевое назначение – здание неустановленного назначения, наименование – бытовая ИРК, что подтверждается свидетельством о государственной регистрации от 8 ноября 2016 года за номером 110/530-18006, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Цена объекта: 40 000,00 рублей, без НДС.

3) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-113042, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/6, общей площадью 79,1 кв. м, целевое назначение – здание неустановленного назначения, наименование – станция перекачки конденсата, что подтверждается свидетельством о государственной регистрации от 6 января 2017 года за номером 110/530-18306, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Цена объекта: 40 000,00 рублей, без НДС.

### ЛОТ № 10 – 40 000,00 рублей, без НДС

1) Изолированное помещение с инвентарным номером 110/D-2775740, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/28-2, общей площадью 224,8 кв. м, целевое назначение – производственное помещение, наименование – кузнечный участок в соответствии со свидетельством о регистрации от 6 июня 2017 года за номером 110/530-18700, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестского агентства по государственной регистрации и земельному кадастру» 6 июня 2017 года.

### ЛОТ № 11 – 40 000,00 рублей, без НДС

1) Изолированное помещение с инвентарным номером 110/D-2775739, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/28-1, площадью 373,9 кв. м, целевое назначение – производственное помещение, наименование – участок металлоизделий, что подтверждается свидетельством о государственной регистрации от 6 июня 2017 года за номером 110/530-18699, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

### ЛОТ № 12 – 40 000,00 рублей, без НДС

1) Изолированное помещение с инвентарным номером 110/D-2775742, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/28-3, площадью 135,0 кв. м, целевое назначение – производственное помещение, наименование – участок электроработ, что подтверждается свидетельством о государственной регистрации от 6 июня 2017 года за номером 110/530-18701, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

### ЛОТ № 13 – 40 000,00 рублей, без НДС

1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-114231, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/14, площадью 37,1 кв. м, целевое назначение – неустановленного назначения, наименование – обмоточная ОГЭ, что подтверждается свидетельством о государственной регистрации от 23 октября 2017 года за номером 110/1756-1096, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

**Более подробно с условиями аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 30.01.2018 года**

# БУДУЧЫНЯ АД ІЛАНА МАСКА

## Неверагодныя прагнозы вынаходніка-мільярдэра



**Робаты-забойцы, электрычныя самалёты і каланізацыя Марса — гэта толькі частка неверагодных рэчаў, пра якія кажа вядомы бізнесмен і вынаходнік, прэзідэнт кампаній Tesla і SpaceX Ілан Маск. Вось некаторыя з яго найбольш смелых прагнозаў з нагоды падзей, якія чакаюць нашу цывілізацыю ў будучыні. Адзначым, што станоўчых навін для чалавецтва не вельмі шмат.**

### Усё паедзе на электрычнасці

За выключэннем касмічных караблёў, па словах Маска, усе транспартныя сродкі ў рэшце рэшт будуць працаваць на электраэнергіі. «Самалёты, марскія судны і ўсе іншыя віды транспарту будуць цалкам электрычныя. Не гібрыдныя, як многія цяпер, а цалкам электрычныя. Безумоўна», — заявіў Маск у інтэрв'ю часопісу Marketplace яшчэ ў 2015 годзе. Таксама ён паўтарыў сваё прадказанне на пасяджэнні Нацыянальнай асацыяцыі губернатараў у мінулым годзе. «Для мяне гэта наогул не пытанне. Увесь транспарт, за выключэннем хіба што касмічных ракет, будзе цалкам пераведзены на электраэнергію, — сказаў Маск. — Абсалютна ўвесь. Самалёты, цягнікі, аўтамабілі, марскія караблі. Пытанне заключаецца толькі ў тым, калі менавіта гэта адбудзецца».




У супрацоўніцтве з Boring Company Маск таксама мае намер пабудаваць у Лос-Анджэлесе сетку падземных тунэляў, у якіх аўтамабілі будуць рухацца на электрычных платформах. Ён заявіў, што гэтыя электрычныя «сані» змогуць перамяшчаць аўтамабілі скрозь тунэль з хуткасцю каля 180 кіламетраў у гадзіну.

### І паедзе без чалавека

Акрамя шкоднага для навакolля рухавіка ўнутранага згарання ў аўтамабіляў, а дакладней у кіроўцы, адбяруць яго асноўную функцыю — кіраванне транспартным сродкам. Праз 20 гадоў мець аўтамабіль, не здольны рухацца аўтаномна, без вашага ўдзелу, будзе такой ж рэдкасцю, як сёння мець каня, адзначыў Ілан Маск падчас тэлеканферэнцыі, прысвечанай фінансавай дзейнасці кампаніі Tesla. «Я думаю, што ўсе аўтамабілі ў доўгатэрміновай перспектыве будуць пераведзены на аўтаномны рэжым кіравання. Па-мойму, хутка людзі будуць здзіўляцца, убачыўшы аўтамабіль, які не мае поўнай аўтаноміі, — сказаў ён. — Любыя аўтамабілі, якія будуць выпускацца без функцыі поўнага аўтаномнага кіравання, будуць неканкурэнтаздольныя. Гэта будзе ўсё роўна, што сёння купіць каня. Вы можаце так зрабіць толькі выключна з сваіх глыбока сентыментальных прычын».

### Да 2025 года паляцім на Марс?

Летась у кастрычніку Ілан Маск выступаў на Міжнародным кангрэсе астранаўтыкі і падзяліўся падрабязнасцямі свайго плана: выкарыстоўваць дасягненні кампаніі SpaceX, каб дазволіць людзям да 2025 года дасягнуць Марса. Ён сказаў, што мае намер адправіць пілатуемы касмічны карабель на Марс у 2024 годзе. Аднак малаверагодна, што астранаўты змогуць здзейсніць пасадку на Чырвонай планеце ўжо да 2025 года. Бізнесмен таксама заявіў, што ў канчатковым выніку ён плануе каланізаваць Марс і «зрабіць яго добрым месцам для жыцця людзей».

### Робаты захопяць рынак працы

Выступаючы ў лютым мінулага года на V Сусветным урадавым саміце ў Дубаі, Ілан Маск адзначыў, што развіццё аўтаномнага транспарту нанясе сур'ёзны ўдар па рынку працы. На яго думку, аўтаматызацыя прывядзе да таго, што «усё менш застанецца вытворчых відаў работы, якую робат не зможа зрабіць лепш за чалавека».

### Штучны інтэлект для людзей больш небяспечны, чым ядзерная зброя

Выпрабаванні ракет у Паўночнай Карэі прымусілі многіх людзей затурбавацца з нагоды магчымай ядзернай вайны. Аднак, Маск неаднаразова заяўляў, што ёсць нешта значна больш небяспечнае, чым ядзерная зброя. «Па-мойму, самая вялікая пагроза, з якой мы сутыкаемся як цывілізацыя — гэта штучны інтэлект», — сказаў Маск у ліпені.

Летась восенню Маск напісаў у сваім «Твітары», што «канкурэнцыя паміж краінамі за перавагу ў сферы ШІ на сусветным узроўні», хутчэй за ўсё, стане прычынай пачатку Трэцяй сусветнай вайны. Ён напісаў гэты каментарый у «Твітары» пасля таго, як на некалькі дзён раней расійскі прэзідэнт Уладзімір Пуцін заявіў, што тая краіна, якая стане першай у вобласці ШІ, «будзе кіраваць светам».

### «Базавы даход» для многіх

«Існуе немалая верагоднасць таго, што ў выніку ўсеагульнай аўтаматызацыі мы прыйдзем да ўніверсальнага базавага даходу або нейкай яго альтэрнатывы. Я не ведаю, які яшчэ выхад існуе з гэтай сітуацыі. Па-мойму, гэта менавіта тое, што адбудзецца», — сказаў Маск у інтэрв'ю CNBC. У ліпені падчас пасяджэння Нацыянальнай асацыяцыі губернатараў бізнесмен ізноў паўтарыў гэта прадказанне. «Я думаю, што ў канчатковым выніку мы атрымаем універсальны базавы даход. На мой погляд, мы прыйдзем да неабходнасці такога кроку», — сказаў ён. Цікава, ці задумваўся мільярдэр пры гэтых словах пра краіны, у якіх эканамічнае становішча не такое трывалае, як у асноўных гігантаў Захаду, Азіі ці Амерыкі?

### Кібаргам лягчэй выжыць

Людзі будуць вымушаныя да некаторай ступені пертварыцца ў робатаў, выключна ў мэтах выжывання, сказаў Маск на тым жа Сусветным урадавым саміце ў Дубаі. «З часам, я мяркую, мы, верагодна, убачым больш цеснае зліццё біялагічнага і лічбавага інтэлекту. У асноўным гэта праблема звязаная з прадукцыйнасцю і хуткасцю сувязі паміж нашым мозгам і яго лічбавай версіяй, уласна кажучы, знешняй яго часткай, — сказаў Маск. — Нейкі высокапрадукцыйны інтэрфейс стане тым, што дапаможа дасягнуць сімбіёзу паміж чалавечым і машынным інтэлектам. Магчыма, менавіта гэта дазволіць вырашыць праблему кіравання штучным інтэлектам, а заадно і ліквідаваць пагрозу нашай бескарыснасці».

### Робаты — смяротная зброя

«Ужо сёння існуюць робаты, якія могуць навучыцца хадзіць «з нуля» на працягу некалькіх гадзін. Гэта ў шмат разоў хутчэй, чым любая біялагічная істота», — сказаў Маск, звяртаючыся да аўдыторыі Нацыянальнай асацыяцыі губернатараў. «Самае небяспечнае, што можа быць — гэта што-небудзь накшталт глыбокага аналізу даных у сецібе. Вы пытаецеся, якая шкода можа быць ад глыбокага аналізу даных у сецібе? Ну, напрыклад, можна пачаць вайну, выпусціўшы фальшывыя навіны і падмяніўшы рэальныя ўліковыя запісы электроннай пошты, зрабіўшы падробленыя прэс-рэлізы або проста маніпулюючы інфармацыяй. Пяро значна больш магутная зброя, чым меч».

# ЧЫСЦІЦЬ ПА-НАВУКОВАМУ

## Брытанскія студэнты вылічылі аптымальны спосаб нарэзкі бульбы па-вясковаму

**Студэнты Эсекскага ўніверсітэта ў Вялікабрытаніі перагледзелі рэцэпт бульбы па-вясковаму шэф-кухара Хестана Блюменталя і выправілі яго, паказаўшы, як трэба рэзаць бульбу, каб атрымаць максімальную плошчу хрумсткай скарынкі.**

Бульба па-вясковаму гатуецца так: нарэзаныя клубні спачатку адварваюць поўнасцю, затым сушаць і запякаюць у алеі ці тлушчы. Галоўная вартасць стравы — у разнастайнасці тэкстур: мяккага пюрэ ўнутры і скарынкі па краях. Чым больш скарынкі, тым лепш, вырашылі студэнты і разлічылі, якія разрэзы дазваляюць максімальна павялічыць плошчу кавалка бульбы пры захаванні аб'ёму.




Знакаміты шэф-кухар Хестан Блюменталь вядомы навуковым падыходам да кулінарыі: яго рэцэпты часта вельмі складаныя і шматступеньчатыя. У рэцэпце бульбы па-вясковаму Блюменталь, у прыватнасці, агаворвае сарты бульбы, клубні якіх лепш за ўсё падыходзяць для гэтай стравы — гэта Arran Victory і Maris Piper. Калі ў вас няма бульбы гэтых сартоў, выбірайце самыя сухія і крухмалістыя клубні і пазбягайце занадта вільготных, раіць шэф. Наразаць бульбу Блюменталь раіць крыж-накрыж, аднак гэта — не аптымальны спосаб, вырашылі студэнты з Эсекса. Лепш наразаць бульбу так, як паказана на малюнку справа: тады плошча паверхні кожнай долькі аказваецца максімальнай. Методыка нарэзкі атрымала назву edge cut — краявы зрэз.

Каб праверыць сваё меркаванне, студэнты паставілі эксперымент: яны падрыхтавалі дзве сотні порцый бульбы традыцыйнай і новай нарэзкі і прапанавалі іх добраахвотнікам са студэнцкага кампуса, а таксама кухарам з рэстарана непадалёк. Эксперыментатары прасілі ацаніць арганалептычныя якасці стравы, а затым супаставілі ацэнкі. І студэнтам, і кухарам больш спадабалася бульба, нарэзаная па новай методыцы.

■ Даведнік

# АДКУЛЬ ЛІТР

**Усе мы даўно карыстаемся такім паняццем вымярэння аб'ёму, як літр. З дапамогай яго мы вызначаем ёмістасць сасудаў і аб'ём вадкасці. Адкуль пайшла назва гэтай адзінкі вымярэння?**

Гістарычная назва яго ідзе яшчэ ад французскай адзінкі «літрон». Яна выкарыстоўвалася для вымярэння сыпкіх рэчываў. Велічыня літрона была меншая, чым сучасны літр і складала каля 830 грамаў. Назва «літрон» бярэ свой пачатак ад сіцылійскай манеты таго часу — літра. Калі грэкі захапілі Сіцылію, то ўжылі назву і для сваіх грошай пад найменнем «літр». Акрамя гэтага, існавала і старажытнарымская адзінка для вымярэння аб'ёму — «лібра» (каля 328 грамаў), яшчэ паняцце азначала і манету.

У Беларусі і многіх іншых краінах літр пазначаецца маленькай літарай «л». Першапачаткова ж адзіна правільным міжнародным абазначэннем лічылася лацінская літара «L». Некаторыя метралагічныя арганізацыі доўгі час дабіваліся таго, каб абазначэнне было ў выглядзе загалоўнай літары «L». Аднак існавала правіла, што адзінкі могуць пазначацца загалоўнай літарай, толькі калі яны былі ўтвораны ад прозвішча навукоўца.

Многія арганізацыі (у асноўным медыцынскія) былі незадаволеныя пазначэннем літра ў выглядзе малой літары, бо яго можна зблытаць з лічбай 1. Таму супрацоўнік аднаго канадскага ўніверсітэта прыдумаў міфічнага персанажа з прозвішчам Літр. У некаторых часопісах надрукавалі нават падрабязную біяграфію і звесткі пра навуковую дзейнасць вучонага. І хоць пазней падман раскрыўся, выніку ўсё ж удалося дасягнуць. У 1979 годзе было прынята рашэнне аб дазволе выкарыстання двух абазначэнняў літра: маленькая l і вялікая L. Тое ж самае датычыцца і абазначэння вытворнай ад літра — мілілітра. Гэта паняцце прыдумалі для дакладнасці вымярэння. І калі ў Еўропе да гэтага часу выкарыстоўваюць традыцыйнае пазначэнне «ml», то ў ЗША, Канадзе і Аўстрыі — толькі загалоўную літару, пазначаючы адзінку «mL». У 1901 годзе было прынятае такое азначэнне літра: аб'ём, які займае 1 кілаграм вады. Пры гэтым тэмпература вады павінна быць 3,98 градуса па Цэльсіі, а ціск — 1 атмасфера.

Літр не лічыцца адзінкай СІ (Міжнароднай сістэмы адзінак), адзінка аб'ёму СІ — 1 кубічны метр. Аб'ём літра складае 1 кубічны дэцыметр, адна тысячная ад метра кубічнага. У Беларусі найбольш папулярнай адзінкай вымярэння аб'ёму нароўні з літрам з'яўляецца мілілітр. Яна выкарыстоўваецца паўсюдна — у медыцыне, кулінарыі, хіміі і г. д. ■

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# КАЛІ СЕЯЦЬ ГАРОДНІНУ НА РАСАДУ

**Аптымальны тэрмін пасеву на расаду нават для адной і той жа культуры можа прыкметна адрозніваецца. Універсальны тэрмін назваць практычна немагчыма — занадта шмат індывідуальных фактараў яго вызначаюць. Але яго можна разлічыць, прычым з вялікай дакладнасцю.**

Для гэтага нам трэба ведаць:

- працягласць вегетацыйнага перыяду для канкрэтнай культуры;
- аптымальны для канкрэтнай расліны ўзрост расады пры яе высадцы ў грунт;
- патрабаванні расліны да цяпла;
- умовы вырошчвання (цяпліца, адкрыты грунт);
- пажаданы час ураджаю;
- тэрмін прарастання насення;
- кліматычныя ўмовы рэгіёна.

### Працягласць вегетацыйнага перыяду

Гаворка ідзе пра той час, які праходзіць ад моманту з'яўлення ўсходаў да поўнага фарміравання расліны і збору ўраджаю.

На пакеціку насення ўказваецца працягласць вегетацыйнага перыяду ў днях — яна нам і патрэбна. Ну а для арыенціра можна запомніць «сярэднестатыстычныя» даныя па самых папулярных агароднінных культурах:

- таматы — ад 80 да 140 дзён;
- перац салодкі — ад 90 да 140 дзён;
- баклажан — ад 100 да 150 дзён;
- капуста белакачанная — ад 50 (ультраранняя) да 190 (позняя) дзён.

Як бачыце, дыяпазон досыць вялікі, таму, напрыклад, таматы позніх сартоў на расаду сеюць ужо ў лютым, а то і ў студзені, а ранніх — у сакавіку-красавіку.

### Аптымальны ўзрост расады

Трэба такім чынам выбраць час сяўбы, каб да моманту пасадкі расада дасягнула самага прыдатнага ўзросту.

Рэкамендуемы спецыялістамі ўзрост агароднінай расады для высаджвання ў грунт:

- таматы ранняспелыя — 40—50 дзён;
- таматы сярэдняспелыя — 55—60 дзён;



- таматы познаспелыя — 70 дзён;
- перац салодкі — 50—65 дзён;
- баклажан — 45—60 дзён.

### Патрабаванні расліны да цяпла

Большасць агароднінных культур, якія мы вырошчваем расадным спосабам, вельмі цеплалюбівыя. Выключэнне складае, мабыць, толькі капуста, якая добра пераносіць адносна нізкія тэмпературы. Чаму гэта важна? Таму што гэты паказчык, у канчатковым рахунку, адаб'ецца на часе высадкі расады ў грунт.

Калі баклажан — выключна цеплалюбівая гародніна, то некаторыя з новых сартоў таматаў і перцу, выведзеныя селекцыянерамі для паўночных рэгіёнаў, вызначаюцца невысокімі (для сваёй культуры) патрабаваннямі да цяпла. Марозу не вынесуць, але пры добрым укрыцці іх можна высадзіць на дачы і крыху раней цеплалюбівых сабратоў.

### Умовы вырошчвання

Высадка раслін у цяпліцы і ў адкрыты грунт, як правіла, па тэрмінах адрозніваецца вельмі істотна. Так, для таматаў арыенціровачны час высадкі расады ў летнія (без абагравання) цяпліцы — пачатак мая, а ў адкрыты грунт — першая дэкада чэрвеня, калі застануцца ў мінулым усе магчымыя замаразкі. Натуральна, у першым выпадку мы можам заняцца пасевамі ўжо ў лютым, а ў другім — раней канца сакавіка лепш і не пачынаць.

### Пажаданы час ураджаю

Змяняючы (у разумных межах) тэрміны пасеву насення на расаду, мы ўплываем на тэрмін атрымання ўраджаю, а значыць, зрабіўшы пасевы ў некалькі этапаў, можам падоўжыць перыяд плоданашэння.

Хочам звышранні ўраджай? Выбіраем самыя скараспелыя сарты і сеем іх на расаду як мага раней — з улікам іншых умоў, вядома ж. Пасеем у некалькі тэрмінаў — атрымаем рознаўзроставую расаду, якая і пладаносіць пачне ў розны час. Праўда, высаджваць яе таксама давядзецца паэтапна — гэта трэба ўлічваць.

### Тэрмін прарастання насення

Вось аб гэтай «дробязі» ў разліках нярэдка забываюць. Між тым у некаторых агароднінных культур перыяд ад пасеву да з'яўлення ўсходаў можа складаць 10—15 дзён, а гэта зусім не мала!

Робячы разлікі, заўсёды варта ўлічваць, што тэрмін прарастання насення можа вар'іравацца нават для адной і той жа культуры. І залежыць ён не абавязкова ад якасці насення, але і ад тэмпературы глебы, вільготнасці, глыбіні пасеву насення — гэта значыць умоў, якія мы ім стварылі.

Апрацоўка насення некаторымі прэпаратамі (напрыклад цырконіем) можа паскорыць прарастанне, зрабіць яго больш дружным. Па-рознаму з'яўляюцца ўсходы з сухога і папярэдне намочанага насення. Словам, ёсць нюансы. Але арыентуемся мы, зразумела, зноў жа на сярэднія паказчыкі для абранай культуры:

- таматы — 4—6 дзён;
- перац салодкі — 12—15 дзён;
- баклажаны — 8—10 дзён;
- капуста белакачанная — 4—5 дзён.

### Пераходзім да разліку

Такім чынам, усе складнікі нашай універсальнай формулы ёсць. Што з імі рабіць далей?

1. Выходзячы з кліматычных умоў і ў залежнасці ад умоў вырошчвання, выбіраем арыенціровачную дату.

2. З гэтай даты адымаем аптымальны ўзрост расады абранай культуры. Пры гэтым не забудземся ўлічваць працягласць вегетацыйнага перыяду, указаную на пакуначку насення, і пры неабходнасці карэктуем атрыманы інтэрвал.

3. З разлічанай даты адымаем тэрмін прарастання насення — атрымліваем прыкладныя тэрміны пасеву.

***Важна адно: не спяшацца.*** Пераразлая, занадта рана пасеяная расада не дасць, насуперак чаканням, ранніх і высокіх ураджаяў.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.58 | 17.48 | 8.50 |
| Віцебск — | 8.53 | 17.33 | 8.40 |
| Магілёў — | 8.48 | 17.39 | 8.51 |
| Гомель — | 8.39 | 17.41 | 9.02 |
| Гродна — | 9.13 | 18.04 | 8.51 |
| Брэст — | 9.08 | 18.10 | 9.02 |

## Месяц

*Поўня ў 16.27.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

## Імяніны

***Пр.*** *Апанаса, Кірылы, Марыі, Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра.*
***К.*** *Людвіка, Пятра, Яна, Яны.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Сын пытаецца ў бацькі:**

**— Як мне даведацца, што на самай справе думае пра мяне мая дзяўчына?**

**— Ажаніся з ёй.**

А калі ўжо для смартфона выйдзе праграма «пошук тапак у кватэры»?

**Размова з мужам. Жонка (пяшчотна):**

**— Ты ў мяне такі добры, такі выдатны, такі разумны...**

**Муж (меланхалічна):**

**— Ты разумнейшая.**

**Жонка:**

**— Чаму гэта?**

**Муж:**

**— Ты дома сядзіш, а я працую.**

Жонка есць бутэрброд, вырашыў нагадаць ёй:

— Ты ж не ясі пасля шасці?

— Гэты шосты, пасля яго не буду.




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

Даты | Падзеі | Людзі

## 31 СТУДЗЕНЯ




**1553** год — дата нараджэння Лаўрэнція Зізанія, беларускага педагога, царкоўнага дзеяча, перакладчыка. Працаваў выкладчыкам у брацкіх школах Львова, Брэста і Вільні. У 1596-м выдаў у Вільні першы ў Беларусі і Украіне буквар «Наука ку читаню и розуменю писма словенского», які ўключаў «Лексіс» — беларускі тлумачальны слоўнік (1061 слова), што аблягчаў разуменне стараславянскай мовы, набліжаў яе да жывой мовы народа. Яго «Граматыка славенская» напісана ў форме пытанняў і адказаў на царкоўнаславянскай і тагачаснай беларускай мовах. Граматыка і буквар аказалі вялікі ўплыў на развіццё мовазнаўчых навук усходніх славян. У 1626 годзе прывёз у Маскву напісаны па заданні патрыярха Філарэта «Катэхізіс», у якім на беларускай мове выклаў звесткі з прыроды і даў блізкае да пратэстантызму тлумачэнне царкоўных догматаў. Яго погляды былі абвешчаныя ерэтычнымі. Памёр каля 1634 года.

**1928** год — нарадзіўся (в. Кудрычы Мсціслаўскага раёна) Георгій Фёдаравіч Юрчанка, беларускі пісьменнік, літаратуразнаўца, крытык. Аўтар кніг літаратурных пародый і эпіграм «Немеладычныя мелодыі», «Распрэжаны Пегас» і інш. Вядомы і як збіральнік народнай лексікі і фразеалогіі.




**1924** год — прынятая першая Канстытуцыя СССР. Яна складалася з двух раздзелаў: Дэкларацыі і Дагавора аб утварэнні СССР. У Дэкларацыі аб утварэнні СССР былі сфармуляваны прынцыпы аб'яднання рэспублік (добраахвотнасць і раўнапраўе), асаблівы характар нацыянальнай палітыкі Савецкай дзяржавы (тут былі выкладзены толькі палітычныя, але не юрыдычныя аспекты). Галоўны сэнс гэтай першай саюзнай Канстытуцыі, у адрозненне ад Канстытуцыі РСФСР 1918 года, — замацаванне і канчатковае юрыдычнае афармленне ўтварэння СССР і падзел правоў СССР і саюзных рэспублік. Таксама яна дала вычарпальны пералік прадметаў кампетэнцыі Саюза, да якіх былі аднесены: знешнія зносіны і гандаль, вырашэнне пытанняў пра вайну і мір, арганізацыя і кіраўніцтва ўзброенымі сіламі, агульнае кіраўніцтва і планаванне эканомікі і бюджэту, распрацоўка асноў заканадаўства.




**1943** год — у падвале Цэнтральнага ўнівермага Сталінграда быў узяты ў палон штаб гітлераўскай 6-й палявой арміі на чале з генерал-фельдмаршалам Фрыдрыхам Паўлюсам, які камандаваў групоўкай нямецка-фашысцкіх войскаў у Сталінградскай бітве.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 389.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 студзеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12